ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарковым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы дарамэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Усіх краёў, злучайцеся!
ПРАЛЕТАРЫ

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

АЎТОРАК, 10 чэрвеня 1930 г.
№ 134 (3732)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Словы і справы

Выпадкова выкрыты, але не выпадкова падрыхтаваны замах на савецкае прадстаўніцтва ў Варшаве востра паставіў пытаньне аб польска-савецкіх адносінах і аб тэй рэальнай пагрозе міру, якая існуе і якая павялічваецца з боку польскіх імпэрыялістых. Сталае паказваньне савецкага друку на ўсю актуальнасьць ваеннай небясьпекі звычайна малюецца замежным буржуазным і сапыял - фашыстскім друкам, як выдуманыя і ні на чым не абгрунтаваныя алярмы. **Бомба ў коміне савецкага поўпрэдзтва яшчэ раз пацьвердзіла рэальнасьць і правільнасьць нашых трывожных сыгналаў.**

Савецкі ўрад у сваёй першай і другой ноце польскаму ўраду ясна і выразна падкрэсьліў, што адказнасьць за замах на наша прадстаўніцтва кладзецца на ўсю тую атмасфэру антысавецкага цкаваньня, якая створаецца польскім друкам пры яўным патураньні з боку кіруючых колаў фашыстскай Польшчы. Прадоўныя масы Савецкага Саюзу патрабавалі каб польскі ўрад рашучым і неадкладным расьсьледваньнем выкрыў сапраўдных вінаватых гэтага замаху. Ня гледзячы на тое, што пасьля выкрытай бомбы мінула больш месяца, расьсьледваньне справы тармазілася пры адначасовых правакацыйных выпадах польскага друку супроць СССР. Мы ўжо паведамлялі, што гэтыя правакацыйныя выпады даходзілі да такой нахабнасьці, што рабілі савецкае поўпрэдзтва арганізатарам замаху на самога сябе. Гэта зацяжваньне расьсьледваньня прымусіла савецкі ўрад у сваёй другой ноце ў спакойных, цьвёрдых словах «вьярнуць увагу ўраду Польскай Рэспублікі на створанае становішча... і на неабходнасьць ужыцьця рашучых мер у мэтах высьвятленьня абставін замаху 26-га красавіка»...

Адказ, пераданы міністрам замежных спраў Польшчы Залескім нашаму поўпрэду тав. Антонаву - Аўсеенку, прадстаўляе з сябе **дакумант, які па сутнасьці справы, прабуе ўвільнуць ад ясных пастаноўкі пытаньня.** Па сутнасьці справы гэта адказная нота вяльможнага толькі фармальнай адпіскай, якая ня можа задаволіць шырокіх працоўных мас Савецкага Саюзу. Нота польскага ўраду ні адным словам не адказвае на пытаньне аб зацяжваньні і марудлівасьці сьледзтва. Нота дае чарговыя абяцаньні давесьці сьледзтва да канца. Але гэтыя абяцаньні і агульныя фразы аб тым, што сьледзтва «будзе ўвенчана стаўочымі вынікамі» разыходзяцца з сапраўдным становішчам спраў і таму зьяўляюцца толькі плятанічнай фразай.

Характэрна, што нота польскага ўраду гаворыць аб тым (і падкрэсьлівае гэта), што бомба ў коміне будынку савецкага поўпрэдзтва «выкрыта польскімі ўладамі бясьпекі». Гэтая заява рэзка супярэчыць рэчаіснасьці. Агульна відома, што бомба была выкрыта толькі дзякуючы выпадку, ня дзякуючы чуйнасьці «польскіх улад бясьпекі» (якія, між іншым, вывяліся шмат пазьней пасьля выяўленьня бомбы), а ў выніку выпадковага выкрыцьця дворнікам. Падобная заява па-сутнасьці змазвае ўсё значэньне выкрытага замаху на савецкае поўпрэдзтва.

Абстаноўка, створаная для нашых прадстаўнікоў у Польшчы, зьяўляецца пастаянной і ўсё больш узрастаючай пагрозай врыву мірных адносін. І як відаць з адказнай ноты, колы, ад якіх залежыць лёс польскай палітыкі, ня маюць намеру зьмяніць гэтую абстаноўку.

Не выпадкова-ж, што амаль у той-жа дзень, калі была перадана тав. Антонавым - Аўсеенкам нота польскаму ўраду, у газэце «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны», газэце, блізкай да ўрадавых колаў, зьяўляецца правакацыйнае паведамленьне, якое «намякае», што савецкае поўпрэдзтва стаіць вельмі блізка да вінаватых няўдалага замаху. Газэта, як відаць, некім інспіраваная, заяўляе, што «ня трэба забываць, што ўся справа мае нязвычайна патаемны і далікатны характар, такі як напрыклад, афэра са зьнікненьнем генэрала Куцепава». Мы ведаем куды цэліць пілсудчыкаўская газэта са сваімі правакацыйнымі заявамі аб афэры з Куцепавым. Мы ведаем, што французкая, польская і інш. прэса стварыла вакол гэтае афэры шалёную антысавецкую сьвістапляску. Зьяўленьне амаль адначасова ноты Залескага і правакацыйных выдумак краківскай газэты, прымушае **нас з тым большым недавер'ем адносіцца да пацыфісцкіх фраз і заяў польскага міністра замежных спраў.**

Разам з гэтым, апошнія дні прыносяць нам паведамленьні аб новым ажыўленьні антысавецкіх сіл унутры Польшчы. Пасьля пацыфісцкіх, нявартых і ламаная гроша, заяў пілсудчыкаўскага афіцыёзу («Газэты Польскай», мы назглядаем, як на старонках гэтай-жа газэты і ўсяго ўрадавага друку пачынаецца новая антысавецкая кампанія. На гэты раз кампанія вядзецца вакол «тэарытычных разважаньняў» аб будучым лёсе Украіны, аб адарваньні Савецкай Украіны ад СССР, аб стварэньні «незалежнай» Беларусі і ўсё гэта з яўнай мэтай — падрыхтоўкі ўзброенага нападу на Савецкі Саюз, падрыхтоўкі ўсіх контр - рэвалюцыйных сіл да гэтага нападу. У сувязі з 10-годзьдзем Кіеўскага паходу польскі друк, пры яўным патураньні з боку ўраду, вядзе антысавецкую кампанію. У вывязку з гэтым «юбілеем» вядзецца падрыхтоўка да вялікіх «урачыстасьцяй», якія будуць насіць яўна антысавецкі характар.

Уся польская прэса паведамляе аб нейкім палітычным «дагаворы», заключаным паміж украінскім арцыбіскупам Шептыцкім і польскім урадам. Гэтыя апэратычныя «дагаворы» маюць той палітычны сэнс, што зноў і зноў прабуюць мабілізаваць «грамадзкую думку» вакол нытаньняў вайны супроць Савецкай Украіны.

Учора ў савецкім друку пісалася аб новым антысавецкім труку польскага ўраду — мы тут маем на ўвазе новы дагавор з урадам «УНР», з гэтымі пятлюраўскімі Ноздравымі, паводле якога польскі ўрад «купляе» ў гэтых апэратачных «правіцеляў» гарады савецкай Украіны. Пісалася таксама аб тэй рэвалюцыі ў шкляницы вады, якая адбылася ў гэтым урадзе па маху дырыжэрскай палачкі Бэльвэдэру п. п. Славэка і Юзэфскага.

Невыпадковым зьяўляецца візыт французкай ваеннай эскадрыльлі ў Варшаву, які адбудзецца бліжэйшымі днямі і вакол якога польская прэса ўзьнімае немалы шум. Па гэтай-жа лініі ідуць такія падзеі, як узмоцнены абмен візытамі польскага генштабу з французкім і румынскім генштабамі. Зусім яўны палітычны сэнс таксама мае і палітыка Польшчы сярод прыбальтыцкіх дзяржаў, якая працягвае актывізавацца.

Усе гэтыя факты і падзеі зьяўляюцца лепшай ілюстрацыяй, выкрываючай фразы аб міры з боку пана Залескага. Як усе гэтыя факты, так і нездавальняючы адказ польскага ўраду на другую савецкую ноту яшчэ і яшчэ раз прымушаюць нас **з выключнай увагай сачыць за актыўнай работай антысавецкіх сіл, якая адбываецца ў Польшчы, і якая рыхтуе ваенны паход супроць Краю Саветаў.**

З тым большай сілай мы павінны завастрыць нашу пільнасьць, што якраз у другім краі, **у Румыніі, якая зьяўляецца, як вядома, ваенным і палітычным саюзьнікам фашысцкай Польшчы, адбыўся на гэтых днях ваенна-фашысцкі пераварот** (гл. тэлеграмы ў сёнешнім нумары «Зьвязды»). Гэты пераварот, які ставіць на чале ўлады найбольш рэакцыйную, ваенна - фашысцкую кліку, накіраваны бляўмоўна сваім лёзам і супроць Савецкага Саюзу. Міжнароднаму імпэрыялізму, перш за ўсё імпэрыялістычнай Францыі, патрэбна стварэньне ў Румыніі такой улады, улады ваенна-фашысцкай дыктатуры, якая-б яшчэ хутчэй і яшчэ лепш рыхтавала вайну супроць Савецкага Саюзу і яшчэ больш актыўна і рашуча распраўлялася-б са ўсімі праяўленьнямі рэвалюцыйнага змаганьня румынскіх працоўных і прыгнечаных мас акупаванай Басарабіі. Падзеі, што адбыліся ў Румыніі, нельга расцэньваць інакш, як новы крок да ўзмацненьня ваеннай небясьпекі, як новы крок, накіраваны да ўзмацненьня антысавецкага блёку і падрыхтоўкі антысавецкай вайны. Устанаўленьне ваенна-фашысцкай дыктатуры ў Румыніі зробіць яшчэ больш моцнымі і непаўрымымі сувязі з фашысцкай дыктатурай Польшчы і перш за ўсё ў пытаньнях агульнай падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу.

Пераварот у Румыніі прымушае працоўных масы нашага краю з яшчэ большай увагай сачыць за тым, што адбываецца ў гэтым краі, які зьяўляўся і будзе зьяўляцца верным агентам міжнародных імпэрыялістых і адным з першых атрадаў, які будзе кінуты імі на Савецкі Саюз.

Працоўныя БССР, занятыя мірным сацыялістычным будаўніцтвам, знаходзяцца на грані з капіталістычным сьветам. Гэта ўскладае на іх асабліва адказную задачу — з падвойнай чуйнасьцю адносіцца да пытаньняў умацаваньня абароназдольнасьці краю і быць заўсёды гатовымі да абароны свае мірнае працы ад нападаў імпэрыялістых.

Абмен нотамі паміж СССР і Польшчай

31-га мая поўнамоцны прадстаўнік СССР у Польшчы тав. АНТОНАЎ-АЎСЕЕНКА перадаў выконваючаму абавязкі міністра замежных спраў Польшчы і віцэ-міністру ВЫСОЦКАМУ ноту наступнага зьместу:

Савецкая нота

«Пан міністар!

Нотай ад 28-га красавіка гэтага году Саюзны ўрад зьвярнуў увагу ўраду Польскай Рэспублікі на сур'ёзнасьць становішча, якое стварылася ў рэзультаце замаху на выбух будынку поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы.

Саюзны ўрад чакаў ад ураду Польскай Рэспублікі, на якім пляжыць адказнасьць за бясьпеку, забесьпячэньне адпавядаючых нормам міжнароднага права ўмоў работы поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы, што будуць ужыты энэргічныя эфэктыўныя мерапрыемствы ў мэтах прасячэньня злачыннай дзейнасьці тых фактараў у Польшчы, якія сыстматычна імкнуцца выклікаць сур'ёзныя ўскладненьні ва ўзаемаадносінах паміж СССР і Польшчай, ня спыняючыся дзеля гэтай мэты перад тэрарыстычнымі актамі супроць дыпляматычных прадстаўнікоў СССР.

Ня гледзячы на тое, што з моманту выкрыцьця замаху 26-га красавіка, мінула ўжо больш месяца, Саюзны ўрад вымушаны канстатаваць, што ён да гэтага часу ня толькі не атрымаў ад ураду Польскай Рэспублікі адказу на сваю ноту ад 28 красавіка гэтага году, але ня мае ніякага афіцыйнага паведамленьня, з якога было-б відна, што польскімі ўладамі зроблены ўсе напежныя вывады з настолькі важнага факту, як выкрыцьцё спробы ўзарваць будынак поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Варшаве. Да гэтага часу ня толькі ня выкрыты вінаватыя ў арганізацыі гэтага замаху, але няма афіцыйных паведамленьняў, на падставе якіх можна было-б чакаць хуткага выкрыцьця ініцыятараў і выканаўцаў замаху 26-га красавіка.

З другога боку, як вынікае з прыкладзенай памятнай запіскі, ня гледзячы на паведамленьне варшаўскай пракуратуры аб дазволе міністрам юстыцыі Царам азнаямленьня поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР з матар'ялямі сьледзтва, апошніе, ня толькі ня было дапушчана да такога азнаямленьня, але да гэтуль ня можа атрымаць копій пратаколаў аб тых сьледчых дзеяньнях, у якіх прымалі ўдзел прадстаўнікі поўпрэдзтва, а таксама пратаколы экспэртызы выкрытага 26 красавіка выбуховага знаряду.

Паказаныя вышэй адносіны польскага ўраду і яго органаў да падзей 26 красавіка з вынікаючымі з яе вывадамі ня спрыяюць ліквідацыі тэй небясьпечнай абстаноўкі ў Польшчы, якая палягчае дзейнасьць фактараў, што імкнуцца справакаваць канфлікты ў савецка-польскіх адносінах. Гэта дзейнасьць знайшла таксама сваё выяўленьне ў радзе зусім недапушчальных выпадаў польскай прэсы супроць поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР аж да абвінавачваньня Саюзных дзяржаўных органаў у арганізацыі замаху 26 красавіка, прычым маўчаньне польскіх улад з поваду гэтага замаху ня можа не палягчаць пашырэньня інсынуацый з боку злонамерных элемэнтаў.

Саюзны ўрад прымушаны з прычыны ўсяго гэтага яшчэ раз зьвярнуць увагу ўраду Польскай Рэспублікі на створанае становішча, якое абцяжарвае савецка-польскія адносіны, на неабходнасьць ужыцьця рашучых мер у мэтах высьвятленьня абставін замаху 26 красавіка, выкрыцьця вінаватых і прасячэньня злачынных дзейнасьці тых фактараў у Польшчы, якія імкнуцца да справакаваньня канфлікту паміж Польшчай і Савецкім Саюзам. Саюзны ўрад чакае ад ураду Польскай Рэспублікі інфармацыі па сутнасьці справы аб замаху на ўзарваньне поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР і ўжытых польскім урадам мерах у мэтах забесьпячэньня поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР ад дапейшых замахаў злачынных элемэнтаў.

Прымеце і г. д.».

Антонаў-Аўсеенка.

Да ноты дадана памятная запіска, у якой падаюцца факты, якія сьведчаць, што польскія ўлады, выказаўшы спачатку згоду на дапушчэньне прадстаўнікоў поўпрэдзтва да азнаямленьня з матар'ялямі сьледзтва па справе аб замаху, узялі потым гэту згоду назад, запрапанаваўшы поўпрэдзтву атрымліваць вусную інфармацыю ад пракурора, які вядзе сьледзтва. Характар гэтай вуснай інфармацыі прымусіў, аднак, поўпрэдзтва адмовіцца ад дапейшага знаёмленьня з гэтага спосабу азнаямленьня са сьледчымі матар'ялямі па справе замаху. У памятнай запісцы далей паказваецца, што, ня гледзячы на шматлікія звароты ў міністэрства замежных спраў, поўпрэдзтва ў працягу звыш месяцу не магло атрымаць пратакопу экспэртызы выкрытай 26 красавіка бомбы, а таксама пратаколаў агляду месца злачынства, складзеных у прысутнасьці прадстаўнікоў поўпрэдзтва.

5-га чэрвеня поўнамоцным прадстаўніком СССР у Польшчы тав. Антонавым-Аўсеенкам была атрымана адказная нота польскага ўраду наступнага зьместу:

Адказная нота Польскага ўраду

«Пан міністар!

Пацьвярджаючы атрыманьне Вашых нот ад 28 красавіка і 31 мая г. г. па справе выкрыцьця бомбы ў коміне будынку пасольства Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у Варшаве, на Пазнанскай вул., маю гонар паведаміць ніжэйпадпісанае:

З моманту выкрыцьця памянёнае бомбы польскімі ўладамі бясьпекі, судовыя ўлады, якім даручана сьледзтва па справе выкрыцьця вінаватых, нашчасьце, у наўдалым замаху, са ўсёй старэннасьцю прыступілі да сваёй акцыі, ні на мінуту не перарвалі ўзмоцненых пошукаў, накіраваных да высьвятлення вінаватых. Тая акапічнасьць, што вінаватыя ў замаху ня былі злоўлены на месцы злачынства, а таксама і тое, што да гэтага часу не ўдалося ўстанавіць дакладнай даты правядзеньня электрычнага провазу на даху дому суседняга з будынкам пасольства Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, што, напаўна, магло, нават, мець месца за некалькі дзён да выкрыцьця гэтага провазу, выклікае сур'ёзнейшыя ўскладненьні, якія затрудняюць сьледзтва польскім судовым уладам.

Хаця судовае сьледзтва натыкаецца, як гэта вынікае з вышэйпаданага, на рад надзвычай цяжкіх для вырашэньня загадак, тым ня менш, аднак, яно праводзіцца далейшым узмоцненым тэмпам і можна выказаць надзею, што яно скончыцца станоўчымі рэзультатамі.

Я дазваляю сабе таксама запэўніць Вас, пан міністар, што ўрад Польскай Рэспублікі, надаючы вялікае значэньне ўмацаваньню і паглыбленьню мірных адносін паміж Польскай Рэспублікай і Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік поўнасьцю ўсьведамляе абавязкі, якія ўскладаюцца на яго ў моц неабходнасьці забесьпечыць бясьпеку і пакой прадстаўніком Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, акрэдытаваным на тэрыторыі Польскай Рэспублікі.

Прашу Вас, пан міністар, прыняць выяўленьне пашаны».

Аўгуст Залескі.

УсеКП(б) насустрач шаснаццатаму

На абласных партканфэрэнцыях

2-ая Маскоўская

З надзвычайнай актыўнасьцю абмяркоўваюць бальшавікі Маскоўскай вобласьці справаздачу МК партыі. Выступаючыя таварышы адзначаюць памылкі ранейшага кіраўніцтва МК. Аднак, **усе прамоўцы сходзяцца на тым, што, ня гледзячы на мэўшыя месца загібы, агульная палітычная лінія МК была правільнай.** Толькі пры даламозе ЦК маскоўская арганізацыя стала на шлях энэргічнага выпраўленьня перагібаў у калгасным руху.

У ранішнім пасяджэньні выступіў **тав. Эйдэман** (Ваенная Акадэмія). «Высокая маральна-палітычная ўстойлівасьць Чырвонай арміі, якая складаецца ў большасьці з сялян — гаворыць ён — абвяргае ўсе толкі правых аб размычцы паміж рабочай клясай і сялянствам. Вось адзін з фактаў гэраізму і ўстойлівасьці: адзін з байцоў Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі, беспартыйны селянін, ідучы ў бой, сказаў свайму політкіраўніку: «Калі мяне заб'юць—прашу лічыць, што загінуў камуністы».

У вячэрнім пасяджэньні 8-га чэрвеня прывітаўны канферэнцыю ад імя рабочых заводу **«Красный Каучук»** дэлегат паведаміў, што **рабочыя заводу пастанавілі ўзьняць перад УсеЦВК хадайніцтва аб узнагародзе першага вучня Леніна, правадыра партыі т. Сталіна ордэнам Леніна.** Прапанова дэлегаціі заводу «Каучук» была сустрэтая бурнымі воплескамі.

ЛЕНІНГРАДЗКІЯ БАЛЬШАВІКІ ПРЫЗНАЛІ ЛІНІЮ ЦК ПОЎНАСЬЦЮ ПРАВІЛЬНАЙ

ЛЕНІНГРАД. Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад т. МОЛАТАВА аб рабоце ЦК 3-я Ленінградзкая абласная партканфэрэнцыя ўхваляе цалкам і поўнасьцю палітычную і арганізацыйную лінію ЦК. Канфэрэнцыя патрабуе ад былых лідэраў правага ўхілу ня толькі адмаўленьня ад сваіх антыленінскіх капітулянцкіх поглядаў, але актыўнай і рашучай барацьбы супроць усякага роду апартуністычных ухілаў і правага ўхілу, у першую чаргу. Партыя, пад кіраўніцтвам ЦК, у непрымірымай барацьбе з прывым апартунізмам, «левымі» загібамі, а таксама ўсякімі праяўленьнямі прымірэнцтва да гэтых ухілаў амыцьцяўляе калектывізацыю вёскі, ліквідацыю кулацтва, як клясы, замацоўваючы дасягнутыя посьпехі, надалей рухаецца наперад.

НА ПАЎНОЧНА-КАЎКАСКАЙ

РАСТОЎ-НА-ДОНЕ, 7. 6-га чэрвеня на вячэрнім пасяджэньні адкрыліся спрэчкі па дакладу тав. Варашылава. Выступілі 12 дэлегатаў. Усе яны ўхвалялі генэральную лінію партыі. Старшыня крайвыканкому тов. Півавараў запрапанаваў абмеркаваць пытаньне аб нерэтраўнай Паўночнага Каўказу ў дасьледчы край сельскай гаспадаркі, матывуючы гэта вялізарнымі посьпехамі калектывізацыі наяўнасьцю ўзорных калгасаў і ростам сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва.

Па Савецкім Саюзе

ПАШЫРЫЦЬ ПРАКТЫКУ

МАСКВА. Прэзыдыум УсеЦСПС падагуліў вынікі практыкі прызначэньня старшынь вытворчых парад памдырэктарамі прадпрыемстваў па рэалізацыі рабочых прапаноў. Практыка цалкам сябе апраўдала. На прадпрыемствах, дзе былі вылучаны рабочыя памдырэктары, хутчэй сталі рэалізавацца прапановы рабочых, значна ўзрасла ініцыятыва рабочых, стварыліся лепшыя ўмовы разьвіцьця сацыялістычнага і ўдарніцтва. **Прэзыдыум УсеЦСПС пастанавіў значна павялічыць лік прадпрыемстваў, у якіх старшыні вытворчых нарад павінны быць прызначаны памдырэктарамі.**

ПАСТАНОВА ЦК НЯ ВЫКАНАНА

МАСКВА. Прэзыдыум УсеЦСПС канстатаваў, што пастанова ЦК партыі аб поўным ахопе няпісьменных членаў прафсаюзаў школамі няпісьменных ня выканана. Па ўсіх саюзах школамі ахоплена толькі 70 проц. няпісьменных рабочых. Цэнтральным камітэтам саюзаў тэкстыльшчыкаў, гарбароў, мэталістых, горнарабочых, сельгаслесрабочых, швэйнікаў, хэмікаў абвешчана вымова за адсутнасьць кіраўніцтва работай ліквідацыі няпісьменнасьці.

СТАН ВЫКАНАНЬНЯ НАШАГА БЮДЖЭТУ

МАСКВА. Паводле папярэдніх даных, за 8 месяцаў 1929-30 году па адзіным дзяржаўным бюджэце паступіла прыбыткаў каля 6.930 мільёнаў руб., выдаткавана каля 6.808 мільёнаў руб.

300 НОВЫХ СЬВІНЯВОДЧЫХ САЎГАСАЎ

Сьвіняводтрэст выпрацуе арганізаваць у 1930-31 годзе 300 новых сьвіняводчых саўгасаў

НАРАДА ПА ВЫКАРЫСТАНЬНІ СОІ

МАСКВА, 9. У інстытуце соі Ўсесаюзнай Акадэміі Сельгаснавук імя Леніна адкрылася нарада на выкарыстаньні соі ў масавым харчаваньні. Соя набывае асаблівае значэньне ў сувязі з нястачаю тлушчаў і бялкоў, бо з соі атрымліваюць масла, малако і інш. прадукты. У бягучым годзе засеяна соіі звыш 300.000 гэкт.

Напярэдадні перавыбараў камсамольскіх органаў

МАСКВА. Напярэдадні IX зьезду ленінскага камсамолу і зараз-жа пасьля скончэньня работ XVI зьезду партыі пачынаецца перавыбарчая кампанія органаў камсамолу. У адозьве ЦК УсеЛКСМ гаворыцца, што асноўнай задачай перавыбарчай кампаніі павінна быць далейшае павышэньне клясавай баяздольнасьці саюзу на падставе мабілізацыі шырокіх мас камсамольцаў і ўсёй рабочай моладзі на выкананьне пастаноў XVI партзьезду. ЦК УсеЛКСМ папярэджвае камсамольскія арганізацыі аб небясьпецы «левых» загібаў, якія могуць вынікцца пры правядзеньні перавыбарчай кампаніі, у адхіленьні ад кіраўніцтва маладых сераднякоў - калгасьнікаў, паказаўшых сваю адданасьць партыі і камсамолу. Разам з тым, павінна быць падкрэслена правая небясьпека, якая заключаецца ў «асераднячваньні» зьвяньняў кіраўніцтва вясковых арганізацый.

ЦК УсеЛКСМ ставіць перад камсамолам канкрэтную задачу — дабіцца зруху ў ажыцьцяўленьні лёзунгу поўнага ахопу саюзам рабочай і батрацкай моладзі. Перазьбары саюзных органаў (ячэйкі, райкомы, акругкомы і г. д.) трэба правесьці з 1-га ліпеня да 1-га верасьня 1930 году.

Устанаўленьне ваенна-фашысцкай дыктатуры ў Румыніі

Новы крок у падрыхтоўцы антысавецкай вайны

ПА ЗНАКУ ДЫРЫЖЭРСКАЙ ПАЛАЧКІ

ВЕНА, 9. Паводле вестак з Бухарэсту, у Клаўзэнбург прыляцеў з Мюнхэна былы пасьледны прынц Кароль. Склікасьцца сумеснае пасяджэньне палаты дэпутатаў сэнату для перагляду закону аб пазбаўленьні Караля прастолу. Паводле афіцыйнага паведамленьня прынц Кароль вярнуўся са згоды ўраду замяшчаць у якасьці рэгента прынца Мікалая. Прыезд прынца Караля пацягне за сабой абвастрэньне барацьбы ў буржуазным лягеры. Правадыр лібэралаў Братыяну заявіў, што ў выпадку звароту прынца Караля лібэралы пастаяць на чале дзяржавы другую дынастыю.

ПАРЫЖ, 9. Французкі друк удзяляе многа ўвагі звароту прынца Караля ў Румынію. «Тан» выказвае трывогу з прычыны магчымасьці сутычкі паміж падтрымліваючымі Караля фашысцкімі элемэнтамі арміі і іншымі групоўкамі. «Тан» піша: «Парадак унутры краю зьяўляецца важнейшай прадпасылкай кансалідацыі вялікай Румыніі. Непасрэднае суседзтва з Савецкім Саюзам, небясьпечныя махінацыі маскоўскай прапаганды ўскладаюць на ўсіх абавязак хавраваць партыйнымі меркаваньнямі ў імя бясьпечнасьці адзінства румынскага каралеўства.

ВЕНА, 9. Прынц Кароль вярнуўся ў Бахарэст з ведама і пры падтрымцы Маніу. На экстраным пасяджэньні ўраду прэм'ер Маніу і чатыры іншыя міністры выказаліся за ўступленьне прынца Караля ў регенцкую раду, а 7 міністраў за абвяшчэньне прынца Караля каралём. Застаўшыся ў меншасьці Маніу падаўся ў адстаўку. Новы пераходны габінэт сфармаваны Міранэску ў наступным складзе: прэм'ер і міністар замежных спраў Міранэску, міністар унутраных спраў Паповіч, вайсковы міністар генэрал Кандэску і др. Габінэт склікаў пасяджэньне палаты дэпутатаў сэнату для абвяшчэньня прынца Караля каралём, пасьля чаго часовы габінэт подасца ў адстаўку.

* * *

Такім чынам, у Румыніі адбыўся дваццовы пераварот, які не зьяўляецца нечаканасьцю. За апошні час там адбыўся цэлы рад візытаў французкіх палітыкаў, асабліва генэралаў. У Румыніі ў працягу доўгага часу знаходзіцца французкі генэрал Вэрэлё, «спэцыялісты» па румынскіх справах французкага генштабу. Гэта невыпадкова.

Пераварот у Румыніі арганізаваны па знаку дырыжэрскай палачкі французкага генштабу. Пераварот падрыхтоўваўся на працягу доўгага часу.

Навошта французкі імпэрыялізм устанавіў гэтую вайскова-фашысцкую дыктатуру ў Румыніі — зусім ясна. Міжнароднаму імпэрыялізму патрэбна такая ўлада, якая-б добра падрыхтавала вайну з Савецкім Саюзам і забясьпечыла-б у тыле антысавецкай арміі - патрэбны парадак і спакой, якая-б пляхам крывавага тэрору прыгнятала рабочых і сялян і прыгнечаныя нацыянальнасьці Румыніі.

Дзяржаўны пераварот у Румыніі — гэта буйны крок у падрыхтоўцы вайны імпэрыялістых супроць Савецкага Саюзу.

УШАНАВАНЬНЕ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў КАМ. АКАДЭМІІ

МАСКВА, 9. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта). Сёньня вечарам у вялікай залі Камуністычнай Акадэміі, пад старшынствам тав. Луначарскага адбыўся вечар, наладжаны сэкцыяй літаратуры і мастацтва народаў СССР, прысьвечаны 25-гадоваму юбілею літаратурнай дзейнасьці народнага паэты Янкі Купалы.

Зьяўленьне на сцэне юбіляра было сустрэтая бурнымі воплескамі. Тав. Луначарскі ва ўступнай прамове ахарактарызаваў багатую дзейнасьць паэты. У канцы тав. Луначарскі выказаў глыбокае перакананьне, што творчасьць Янкі Купалы стане вядомай шырокім колам працоўных усіх народаў Савецкага саюзу.

Потым юбіляра вітамі прадстаўнікі цэлага раду арганізацый: Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК СССР, Галоўмастацтва, ад федэрацыі савецкіх пісьменьнікаў, ад аб'яднаньня сялянскіх пісьменьнікаў, ад закаўказкай федэрацыі пралетарскіх пісьменьнікаў, ад БДВ РСФСР, ад таварыства культурмычкі з заграніцай, ад украінскіх пісьменьнікаў.

Пасьля прывітаньняў быў заслухан даклад тав. Шукайты аб 25-гадовай літаратурнай творчасьці Янкі Купалы.

САДЗЕЙНІЧАНЬНЕ ВЫНАХОДНІЦТВУ Ў КАЛГАСАХ

МАСКВА. Калгасцэнтр СССР запрапанаваў калгасцэнтрам саюзных рэспублік і калгасам у працягу бліжэйшага часу арганізаваць у калгасах садзейнічаньне вынаходніцтву ў сельскай гаспадарцы. (ТАСС).

212 ТЫСЯЧ ТОН

МАСКВА. Каб павялічыць пагалоўе жывёлы і забясьпечыць насельніцтва патрэбнай колькасьцю мясапрадуктаў, Саюзны Саўнарком абавязаў Наркамгандаль СССР да 1-га кастрычніка 1930 году загатовіць запасы мяса ў колькасьці 212 тысяч тон. (ТАСС).

ПРАЦЯГНУТА РЭАЛІЗАЦЫЯ АЎТАМАБІЛЬНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

МАСКВА. Саўнарком СССР пастанавіў: 1) працягнуць рэалізацыю аўтамабільных абавязацельстваў пад аўтамабілі вытворчасьці 1931-34 гадоў сярод калгасьнікаў і інш. сельскіх кааперацыйных арганізацый да 1-га кастрычніка 1930 г., сярод іншых кааперацыйных і грамадзкіх арганізацый і паасобных працоўных — да 1-га верасьня 1930 г; 2) устанавіць для аплаты абавязацельстваў, падпіска на якія прымаецца пасьля 31 мая 1930 г., наступны парадак: а) пры падпісцы пасьля 31 мая 1930 года, але не пазьней 1 верасьня 1930 года першы узнос аплачваецца ў разьмеры чэрвеньскага ўзносу, а пры падпісцы пасьля 31 жніўня ў разьмеры чэрвеньскага і лістападаўскага ўзносаў; б) другі і наступныя ўзносы вызначаюцца ў тэрміны і ў разьмерах, устаноўленых пастановай ад 28 лютага 1930 г.

СУПРОЦЬ ПАВЫШЭНЬНЯ ЦЭН

МАСКВА, 2. У Цэнтрасаюз СССР паступаюць весткі аб тым, што ў многіх кааперацыйных арганізацыях і магазынах назіраюцца выпадкі захаванага павышэньня цэн на асобныя тавары: нізкасортнае мяса, каўбасныя вырабы, кансэрвы і інш. прадукты прадаюцца па цэнах вышэйшага сорту; гародніну і садавіну прадаюць не на вагу, а паштучна, што падаражае тавар для спажыўца. Цэнтрасаюз паказвае, што да барацьбы з укрытым павышэньнем цэн на тавары неабходна прыцягнуць усю кааперацыйную грамадзкасьць. На месцах патрэбна арганізаваць масавую праверку цэн, шляхам кантрольных закупак, пры чым асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на захаваньне цэн адпаведна сартом адпускаемага тавару. Цэнтрасаюз папярэджвае, што за ўкрытае павышэньне цэн будуць прыцягвацца да судовай адказнасьці як кіраўнікі кааператываў, так і радавыя працаўнікі.

Правыя і „левыя" апартуністыя ўзмацняюць свае атакі на лінію партыі

Бязьлітасны суровы адпор спробам правых ухілістых і „левакоў" атакаваць генэральную лінію партыі, дыскрэдытаваць ленінскую палітыку яе Цэнтральнага Камітэту

МАЦНЕЙ УДАРЫМ ПА ПРАВЫМ УХІЛЕ—ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕЦЫ, І ПА „ЛЕВЫМ" АПАРТУНІЗЬМЕ

Узмацнім агонь направа

Падрыхтоўчая работа партарганізацыі да XVI зьезду характарызуецца магучым ростам палітычнай актыўнасьці партыйных мас і ўзмацненьнем жорткай барацьбы на два фронты са ўсякімі адхіленьнямі ад лініі партыі. Па сіх арганізацыях шырока разгарнулася працоўка тэзісаў ЦК да XVI зьезду УсеКП(б). Партыйныя масы па-дзелавому абмяркоўваюць тэзісы і аднадушна ўхваляюць іх.

Але вакол падрыхтоўкі да XVI зьезду пачынаюць узьнімаць галаву і ўсякія апазыцыйныя элемэнты. Апартуністыя правага і „левага" толку актывізуюцца і прабуюць скарыстаць перадзьездаўскі пэрыяд для новых атак на лінію партыі і яе ленінскае кіраўніцтва, для прапаганды сваіх антыпартыйных «тэорый». Аб актывізацыі і ажыўленьні гэтых апартуністычных элемэнтаў мы ўжо ня раз пісалі, аб гэтым-жі выразна сьведчаць матар'ялы, зьмешчаныя ў сёньнешнім нумары «Зьвязды».

Карэспандэнцыі, зьмешчаныя ніжэй, паказваюць, што правыя і „левыя" ухілістыя імкнуцца выкарыстаць ножны магчымасьць, каб адкрыта, ці ў замаскаванай форме прапагандаваць свае погляды і нападаць на генэральную лінію партыі і яе Цэнтральнага Камітэту. Пры гэтым правыя і „левакі" ўсна зьбліжаюцца ў адным мэтаімкненні — дыскрэдытаваць бальшавіцкае кіраўніцтва ленінскай партыі.

Характэрна, што ў Бабруйску правапартуністычныя вылазкі (гл. карэспандэнцыю з Бабруйску) пайшлі ў лініі спроб атакаваць палітыку Цэнтральнага Камітэту партыі. У ячэйцы вялікай фабрыкі т. Ры

XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

СПРЭЧКІ па справаздачы ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б

Прамова тав. Гантмана

У спрэчках, якія разгарнуліся па дакладу ЦК КП(б)Б як на Менскай партканфэрэнцыі, так і на XIII зьезьдзе КП(б)Б, цэлы рад таварышоў шмат часу, шмат увагі ўдзяляюць некаторым памылковым фармулёўкам, якія былі дапушчаны тав. Васілевічам на працягу раду год.

Тав. Тамашэўскі ў сваім выступленьні ставіў пытаньне так—ці можна крытыкаваць паасобных членаў ЦК, або бюро ЦК. Я лічу, што партзьезд добра ведае аб тым, што ня толькі можна, але патрэбна намылкі кагось там ні было, няхай гэта будзе радавы камуністы, няхай гэта будзе кіруючы працаўнік, калі ён дапушчае ў сваёй рабоце памылкі, няправільныя фармулёўкі, дык трэба іх крытыкаваць. І наша партыя рашуча змагаецца з усякімі спробамі рэгламэнтаваць, абмяжоўваць бальшавіцкую самакрытыку. Наша партыя рашуча змагаецца з усякімі спробамі трацкістых, апартуністычных элемэнтаў у радох нашай партыі скарыстаць самакрытыку для барацьбы супроць генэральнай лініі партыі, скарыстаць самакрытыку ў мэтах дыскредытацыі партыйнага кіраўніцтва.

Але-ж побач з гэтым наша партыя і КП(б)Б змагаліся і будуць змагацца з усякага роду спробамі абмяжоўваць самакрытыку. Наконт тых памылак у выступленьні тав. Васілевіча, на якія зазначаў цэлы рад таварышоў: першае выступленьне яго на пленуме Менскага АК. Члены бюро ЦК, якія знаёміліся са стэнаграмай выступленьня тав. Васілевіча, наколькі мне вядома, зусім згодны і лічаць выступленьне тав. Васілевіча, на пленуме Менскага АК правільным. Як вядома, многімі таварышамі сэнс выступленьня тав. Васілевіча зводзіцца да таго, што ён даў правільны адказ на няправільнае выступленьне т. Гершона, які ставіў пытаньне такім чынам, што пастанова ЦК партыі аб калектывізацыі Беларусі ў асноўным у канцы 1931 г. зьяўляецца першай крыніцай усіх памылак, памылкай усіх памылак.

Ці правільна такая пастаноўка пытаньня? Ці правільна такая арыентацыя партыйнай арганізацыі? Не, няправільная. Я ня маю магчымасьці азнаёміць вас з усім выступленьнем тав. Васілевіча, але магу прачытаць толькі паасобныя месцы для таго, каб не засталося ў зьезда няправільнага ўражаньня, бо тут было сказана, што тав. Васілевіч даў адпор тав. Гершону за тое, што ён быццам-бы сказаў, што ЦК ня хоча прызнаць памылак. Вось гэтае месца:

«Бюро ЦК КП(б)Б яшчэ 17 красавіка апублікавала дакумант, у якім з усёй бальшавіцкай рашучасьцю паставіла пытаньне аб сваіх памылках у пытаньнях правядзеньня калектывізацыі. Гэтаму дакументу, як і ўсёй лініі ЦК КП(б)Б, дадуць належную ацэнку раённыя і акруговыя партканфэрэнцыі, што зараз адбываюцца, а таксама надыходзячы партыйны зьезд».

І далей: «Я ўпэўнен у тым, што гэта ацэнка будзе станоўчай, што бюро ЦК зрабіла необходны крок, правільна паступіла, прызнаючы свае памылкі і гэтым самым мабілізуючы ўсю КП(б)Б на хутчэйшае выпраўленьне дапушчаных скрыўленьняў лініі партыі».

А дзе-ж тут тав. Васілевіч хаваў памылкі ЦК партыі? Ставіў ён гэтае пытаньне, мне думаецца, зусім правільна.

«Бюро ЦК нясе адказнасьць за памылкі, якія былі ім дапушчаны, але ўзвалваць на ЦК партыі ўсё, што каму-небудзь захочацца, гэта недапушчальная справа, ды гэта і ня ўдасца нікому». Мусіць, таварышы маюць на ўвазе якраз гэта месца месца выступленьня тав. Васілевіча, абвінавачваючы яго ў тым, што ён выступіў у ролі заціскаючага самакрытыку на пленуме і даваў няправільны адказ. І яшчэ адна вытрымка: «ЦК партыі адказвае за тое, што ня вёў рашучай барацьбы з тэндэнцыямі асобных раёнаў і акруг калектывізавацца вясною гэтага году на ўсе 100 проц.».

Я думаю, што партыйны зьезд будзе вызначаць думку членаў бюро ЦК партыі, што на пленуме Менскага АК тав. Васілевіч памылкі не зрабіў. На Калрычніцкай раённай партыйнай канфэрэнцыі, дзе я зрабіў даклад ад ЦК партыі, дзе я ставіў пытаньне такім чынам, што пленум Менскага АК даў рашучы адпор т. Гершону за яго няправільнае выступленьне, прысутнічалі члены бюро Менскага АК, якія не супярэчылі супроць гэтага. Я лічу, што яны зусім згодны з тым, што выступленьне тав. Гершона зьяўляецца няправільным. І пасьля гэтага, калі паасобныя таварышы (я лічу, што гэта ня думка членаў бюро Менскага АК) бяруць тав. Васілевіча за гэтае выступленьне, гэта зьяўляецца няправільным.

Адносна выступленьня тав. Васілевіча на пленуме ЦК камсамолу. Гэта стэнаграма таксама ў мяне ёсьць. Я лічу, што асноўная думка тав. Васілевіча правільная. Калі вы азнаёміцеся з усёй стэнаграмай, вы таксама прызнаеце, што асноўная думка яго зводзіцца да таго, што, ня гледзячы на цэлы рад яскравых партыйных дырэктыў аб усёй палітычнай важнасьці работы сярод беднаты, усё-ж гэта работа не раскачана, што аднэй з прычын гэтага зьяўляецца тое, што вясковыя арганізацыі яшчэ і да гэтага часу, нават пасьля чысткі партыі, засьмечаны чужымі элемэнтам, мы гэтага адмовіць ня можам, што гэты чужы элемэнт супроцьдзейнічае лініі партыі па разгортваньні работы сярод беднаты. Асноўная думка правільная, але фармулёўка тав. Васілевіча няправільная. Я ня маю часу агалашаць тых фармулёвак, якія ён прыводзіў, скажам, толькі пра тое месца, дзе ён гаворыць наконт серадняка, што серадняк у радох нашай партыі ня здолеў праводзіць партыйную лінію. Гэтае месца зьяўляецца няправільнай фармулёўкай.

Я ня буду, таварышы, гаварыць адносна іншых выступленьняў, дзе мы ў выступленьнях тав. Васілевіча—гэтага адмовіць нельга — маем паасобныя няправільныя фармулёўкі. Тав. Васілевіч іх прызнаў, тав. Васілевіч, я ў гэтым упэўнен, тут на зьезьдзе з усёй рашучасьцю прызнае, што гэтыя фармулёўкі зьяўляюцца няправільнымі, што зрабіў гэтыя памылкі. Але, таварышы, ці можам мы параўнаць памылковыя паасобныя выступленьні тав. Васілевіча з памылкамі, якія зрабілі некаторыя іншыя таварышы.

Ні ў якім разе не магу параўнаць тых поглядаў, тых праваапартуністычных, нацыянал-дэмакратычных поглядаў, якія выказваў тав. Чарвякоў у цэлым радзе сваіх выступленьняў на працягу доўгага перыяду і якія па правільнай фармулёўцы ЦК зьяўляюцца цэлай сыстэмай праваапартуністычных і нацыянал-дэмакратычных поглядаў, з тымі паасобнымі памылкамі, няправільнымі фармулёўкамі, якія даваў тав. Васілевіч.

Я лічу, што гэта зьяўляецца асноўным. Па лініі, якую праводзіў той ці іншы член партыі, ці той ці іншы партыйны кіраўнік, праявяецца камуністычная ўстойлівасьць, бальшавіцкая вытрыманасьць, а я сьцьвярджаю, што тав. Васілевіч па ўсіх важнейшых пытаньнях, па пытаньні барацьбы з трацкізмам і правым ухілам, па пытаньні барацьбы з прышчэпаўшчынай, па пытаньні барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам і па пытаньні барацьбы са скажэньнямі, памылкамі, дапушчанымі ў калектывізацыі, разам з усім бюро ЦК партыі змагаўся і рашуча змагаўся, правільна праводзіў партыйную лінію ва ўсіх гэтых важнейшых пытаньнях. Я падкрэсьліваю, асабліва ў пытаньні барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, я лічу, на гэтым пытаньні ў першую чаргу праявяецца цэлы рад беларусоў-партыйцаў, што гэта зьяўляецца асялком, на якім можна і патрэбна правяраць вытрыманасьць партыйнай лініі, вытрыманасьць таго ці іншага таварыша.

Я сьцьвярджаю, што лінія тав. Васілевіча ў барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам, ня гледзячы на тое, што тут таварылі адносна гадавіны БДВ, што, быццам, тав. Васілевіч не рэагаваў,—што па ўсіх гэтых пытаньнях тав. Васілевіч праводзіў правільную лінію партыі, правільна праводзіў лінію ЦК партыі.

Другое пытаньне — аб памылках ЦК партыі. Я лічу, што на гэтае пытаньне трэба даць ясны адказ, бо тут цэлы рад таварышоў, якія выступалі, пачыналі з таго, што лінія правільная і ўсё іншае, а ў канцы канчалі цэлым радам абвінавачаньня, якія, бязумоўна, можна кваліфікаваць, як скрыўленьне правільнай партыйнай лініі. Я лічу, што мы павінны на зьезьдзе на гэта грунтоўнае пытаньне адносна палітычнай лініі ЦК партыі даць адказ, ня крывячы душой.

Адносна прышчэпаўшчыны. ЦК партыі лічыць і прызнаў, што яна выкрыта была з некаторым спазьненьнем. Гэта правільна. Але ставіць пытаньне так, як тав. Смаль, які тут сказаў прыблізна (я ня маю стэнаграмы, але запісаў прыблізна, што ён сказаў), што «памылкі прышчэпаўшчыны тлумачацца тым, што Цэнтральны Камітэт партыі быў увесь час пад уплывам дробна-буржуазнай стыхіі»,—гэта значыць узводзіць паклёп на Цэнтральны Камітэт партыі. Так, спазьненьне ў выкрыцьці прышчэпаўшчыны мела месца, але-ж ці можна ставіць так пытаньне, што ЦК тады, калі палітычнае значэньне і ўвесь сэнс прышчэпаўшчыны быў выкрыт, не мабілізаваў на 100 проц. усю партыйную арганізацыю на барацьбу з прышчэпаўшчынай, якая жыла ня толькі ў Наркамземе, але і ў цэлым радзе іншых арганізацый. Я думаю, зьезд адкажа на гэта так, што Цэнтральны Камітэт партыі мабілізаваў партыйныя арганізацыі і па-бальшавіцку, з усёй рашучасьцю паставіў гэтае пытаньне. І іменна дзякуючы гэтаму мы маем рашучы паварот ва ўсёй нашай зямельнай працы.

Я лічу, што ў тав. Васілевіча, у артыкуле, дзе ён кажа, што ў асноўным КП(б)Б перамагла прышчэпаўшчыну, як палітыку, якая арыентавалася на кулацкія гаспадаркі, на хутары, правільная пастаноўка. Гэта ня значыць, што мы ня маем і ня будзем мець праваапартуністычных ухілаў, гэта ня значыць, што нам трэба складаць сваю зброю ў барацьбе з правым апартунізмам. Ні ў якім разе! Я лічу, што той рашучы паварот, які КП(б)Б зрабіла ў калектывізацыі, тыя посьпехі, тая пільнасьць з боку нашай партыйнай арганізацыі і самых шырокіх мас на барацьбу з усякімі элемэнтамі прышчэпаўшчыны, аб гэтым сьведчыць.

Другое асноўнае пытаньне—барацьба з нацыянал-дэмакратызмам. Рад таварышоў прызналі лінію Цэнтральнага Камітэту ў барацьбе з правымі нацыянал-дэмакратызму правільнай. Мы бедаем і рад дэлегатаў на зьезьдзе таварылі аб тым, што ЦК правёў вялікую працу па барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам і шавінізмам усіх масьцей. Тав. Штэйман папракаў, што выводы тав. Затонскага хаваюцца ад КП(б)Б. Я хачу агаласіць пастанову таго няпоўнага Бюро ЦК, якое заслухала папярэднія вывады (бо гэта было, як правільна сказаў т. Астапенка, не абсьледваньне, а вывучэньне практыкі правядзеньня нацпалітыкі па некаторых нацрэспубліках, якое праводзілася па даручэньні ЦК і ЦКК),—Бюро ЦК пастанавіла: «Заслухаўшы папярэднюю інфармацыю т. Затонскага, Бюро ЦК у сувязі з тым, што з 13 членаў Бюро ЦК 7 членаў адсутнічае, у тым ліку адсутнічае старшыня ЦКК, пастанаўляе: разаслаць стэнаграму пасяджэньня Бюро ЦК усім членам Бюро ЦК і Прэзыдыуму ЦКК. Прасіць тав. Затонскага пасьля падвядзеньня канчатковых вынікаў абсьледваньня прыехаць у Менск для абгаварэньня на Бюро ЦК гэтых вынікаў». Была гутарка з тав. Затонскім аб скліканьні партыйнага актыву, на якім абгаварыць вынікі абсьледваньня. Тав. Затонскі ня прыехаў; так што Бюро Цэнтральнага Камітэту не хавала і ня мела намеру хаваць гэты дакумант ад КП(б)Б і даведка тав. Штэймана зьяўляецца, такім чынам, няправільнай.

Аб калектывізацыі. Цэнтральны Камітэт партыі сапраўды дапусьціў рад памылак у практыцы калгаснага будаўніцтва, аб іх ведае партыйны зьезд і я іх паўтараць ня буду, аб іх гаворыць рэзалюцыя ЦК КП(б)Б за 17 красавіка. Я лічу, што іх трэба тут крытыкаваць, гэта бязумоўна. Але, таварышы, палітычная лінія Цэнтральнага Камітэту партыі, па важнейшых асноўных пытаньнях, па пытаньні аб нашых адносінах да серадняка, была бязумоўна правільнай. І тут ніхто ня можа сказаць, што Цэнтральны Камітэт партыі ў гэтым асноўным пытаньні, у тым, каб не адміністраваць у калгасным будаўніцтве, у тым, каб у адносінах да серадняка захаваць правільную лінію, што ЦК КП(б)Б у гэтым пытаньні ня даў яснай устаноўкі. ЦК даў рад папярэджаньняў, рад дакументаў і ў пастанове студзеньскага пленуму і ў лісьце па пытаньні раскулачваньня, які быў разасланы ўсім раённым камітэтам. Цэнтральны Камітэт партыі ў гэтым важнейшым пытаньні адносна недапушчэньня парушэньня ленінскай лініі да серадняка праводзіў правільную лінію. ЦК КП(б)Б ня толькі рашуча і па-бальшавіцку прызнаў свае памылкі ў практыцы калгаснага будаўніцтва, але здолеў павярнуць усю КП(б)Б на барацьбу са скажэньнямі і выпраўленьне памылак, рашуча ўдарыў па тых асобных арганізацыях і асобных таварышох, якія «упорствовали», ня сталі на шлях выпраўленьня памылак сваячасова (Шклоў, Рагачоў, Аршанскі АК і інш.).

Далей, адносна працы сярод беднаты. Большасьць таварышоў. мусіць, чытала і ведае, колькі выразных дырэктыў даваў Цэнтральны Камітэт у гэтым пытаньні, як Цэнтральны Камітэт ставіў з усёй вострасьцю гэтае пытаньне, як фармуляваў студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б, што недаацэнка працы з беднатою зьяўляецца горшым відам праваапартуністычнага ўхілу. Ня гледзячы на гэта, мы ўсё-ж на мясцох ня маем яшчэ да гэтага часу рашучага пералому; яшчэ і зараз мы маем апартуністычную недаацэнку працы з беднатою з боку некаторых нашых арганізацый. У барацьбе за генэральную лінію партыі КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК правяла вялізарнейшую работу. Ніхто з выступаўшых у спрэчках таварышоў не абвінавачвае ЦК ў тым, што ён не змагаўся са ўсёй рашучасьцю з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, асабліва з правым ухілам у тэорыі, з апартуністычнай практыкай, з «левымі» загібшчыкамі і рэштункамі трацкісцкай ідэалёгіі, а таксама з прымірэнцтвам да ўсіх гэтых ухілаў. Іменна на падставе няўхільнай барацьбы за партыйную лінію яшчэ больш узмацнілася адзінства і бальшавіцкая згуртаванасьць радоў КП(б)Б. Гэта зьяўляецца асноўным для ацэнкі палітычнай лініі Цэнтральнага Камітэту.

Спынюся яшчэ на адным пытаньні, якое тут было мала закранута ў спрэчках, але якое мае надзвычай вялікае значэньне, у якім мы ў Цэнтральным Камітэце партыі маем буйнейшы недахоп. Я маю на ўвазе нашу партыйна-масавую працу, перабудову яе ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія перад намі стаяць. Я лічу, што ў гэтым пытаньні ня маем яшчэ належнага пералому, што гэтай перабудовы работы фактычна ня маем, што мы і ў ЦК партыі, і на мясцох да гэтага пытаньня надышлі крыху фармальна, што пры перабудове нашай партыйна - масавай работы мы ня ўлічваем ва ўсёй паўнаце тых вялікіх зьмен, якія мы маем і на прадпрыемствах, і асабліва на вёсцы. На прадпрыемствах, дзе мы маем пыраўзны ўдарніцкі рух, дзе мы маем у асобе ўдарнікаў моцны рабочы актыў, які зьяўляецца рэзэрвам, адкуль партыя чэрпае лепшыя свае сілы, пры дапамозе якога мы праводзім і будзем праводзіць усе нашы важнейшыя пытаньні па сацыялістычным будаўніцтве, мы яшчэ не перабудавалі ўсёй нашай партыйна - масавай работы ў адпаведнасьці з тым вялікім эрухам, які мы маем у рабочай клясе.

З другога боку мы ня ўлічваем, што рабочая кляса ў нас у Беларусі значна амаладзілася. З 1/I 26 г. за тры гады рабочая кляса ўзрасла больш, чым у два разы — з 24 тысяч да 45 з лішкам тысяч. Палова рабочых не прайшла яшчэ належнай пралетарскай школы.

Я лічу, што мы ў нашай рабоце ня ўлічваем усёй адказнасьці гэтага пытаньня, пытаньня палітычна - клясавага выхаваньня новых пластоў рабочых, якія ўліліся ў нашу прамысловасьць. Мы ня ўлічваем таго, што ў нас на прадпрыемствах Беларусі ёсьць толькі 53 проц. старых рабочых, што 47 проц. ёсьць выхадцаў з сялян, значная частка якіх яшчэ зьвязана з зямлёй, былых саматужнікаў і іншых, якія зьяўляюцца выхадцамі з дробна - буржуазнага асяродзішча, ня ўлічваем усяго гэтага, і наша палітычна - выхаваўчая работа да гэтага часу яшчэ слабая.

Тут гаварылі аб тым, што пашырылася сацыяльная база на вёсцы. Мы на сёньняшні дзень маем усяго 3.049 калгасьнікаў - камуністых у той час, як у калгасах мы маем 73.000 сем'яў. Надзвычай тонкая праслойка, не гаворачы аб тым, што праслойка партыйцаў наогул на вёсцы зьяўляецца надзвычай невялікай (14.014 вясковых камуністых на 775 тысяч сялянскіх сем'яў).

Мне думаецца, што нам неабходна больш рашуча ўцягваць у партыю пралетарскія і напаўпралетарскія элементы на вёсцы, калгасьнікаў - беднякоў і лепшых сераднякоў. Нам трэба перабудаваць нашу работу і на прадпрыемствах і на вёсцы, выходзячы галоўным чынам з тых новых зьмен, якія мы маем, асабліва на вёсцы.

Пытаньне наконт партыйных кадраў. Тут цэлы рад таварышоў закранулі гэтае пытаньне. Я хачу зрабіць адну заўвагу на пытаньні партыйных кадраў. Дрэнна стаіць в гэтым справа. Мы пядаўна падлічылі колькі Камвуз даў на працягу 8-х год партыйных работнікаў, і выявілася, што 16 сакратароў райкомаў, дый то некаторыя з іх, наколькі мне вядома, зьняты. 16 сакратароў райкомаў на працягу трох год. Я лічу, што гэта зьяўляецца ненармальным, што наш Камвуз — асноўная кузьня для Беларусі ў падрыхтоўцы партыйных работнікаў у павышэньні іх палітычнага ўзроўню — патрабуе вымены, адчувае патрэбу ў тым, каб пераглядзець усю работу Камвузу. Я лічу, што тут зусім правільны папрок, які рабіўся на адрасе ЦК аб тым, што мы мала робім для таго, каб падрыхтаваць, для таго, каб узьняць тэарытычны ўзровень партыйных работнікаў. Я, вядома, ня згодзен з некаторымі паасобнымі таварышамі, якія ставілі пытаньне, што памылкі, якія былі на вёсцы пры калектывізацыі, тлумачацца выключна палітычнай непадрыхтаванасьцю. Гэта няправільна, але тое, што мы мала зрабілі ў гэтым напрамку — правільна. І я лічу, што нам трэба перабудаваць работу Камвузу, каб ён даваў значна больш пырокую падрыхтоўку. Нам трэба арганізаваць стацыя курсы пры Камвузе, праз якія прапусьціць увесь склад кіруючых партыйных работнікаў, у першую чаргу кіруючых партработнікаў, працуючых на вёсцы.

Прамова тав. Мазура

Таварышы, значная большасьць дэлегатаў зьезду, памойму, правільна ацаніла дзейнасьць ЦК нашай партыі. Я, таварышы, лічу, што мы на працягу ад 12 да 13 зьезду КП(б)Б, як ніколі, мабілізавалі ўвагу ўсяе КП(б)Б на барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам. Асабліва за гэты пэрыяд КП(б)Б правяла вялізарную работу па выкрыцьці нацыянал-дэмакратызму, як адзнак з рознавіднасьцяй правага ўхілу, як адзнак з асноўных небясьпек у нашых умовах.

Мы, таварышы, за апошні час наглядаем такое становішча, што паасобных вучастках нашай работы мы маем некаторае ажыўленьне нацыянал-дэмакратычных вылазак. І, таварышы, прыведу некалькі фактаў з Гомельскай арганізацыі.

Мы таксама мелі за апошні час рад фактаў вылазак яўрэйскага шавінізму, ідэалізацыю БУНД'у і, намойму, невыпадкова выступленьне т. Штэймана, які горкую сьлязу праліў над яўрэйскім мястэчкам. Я ня ведаю, з якіх гэта часоў мы сталі, крытыкуючы свой орган партыі, выліваць на яго цабры грязі. Тав. Штэйман, выступаючы, заяўляе, што ЦК, вядучы барацьбу з правым ухілам, праяўляе правы ўхіл у тых адносінах, што, ударачы на асобных таварышох з яўбюро, сябе выгарадзіў. А вы што хочаце, каб мы вашы памылкі прычаплялі да ўсёй КП(б)Б. Мы ня хочам усё тое, што вы нарабілі, прычаніць да сябе, вы нарабілі, вы і адказвайце.

Я, таварышы, хачу спыніцца таксама на пытаньні аб дапушчаных памылках пры калектывізацыі. ЦК КП(б)Б прызнаў свае асобныя памылкі. Рад акруговых арганізацый таксама, прызнаючы свае памылкі, некалькі фармальна, па сутнасьці, узяліся за выпраўленьне іх у практычнай рабоце.

Мы нядаўна ў сябе сустрэліся з такім фактам, што Белжымалсаюз, даючы дырэктывы абагуліць птушку ў калгасе, у «Дняпроўскую камуну» паслаў 150 племянных пеўняў з дырэктывай: скарыстаньне для абагуленьня птушкі, і па сёньняшні дзень 150 племянных пеўняў ядуць калгаснае збожжа. І гэта таксама будуць прыпісваць памылкам ЦК. Гэта—галавацяпства і гэта было не абагуленьне, а жаданьне прыйсьці на дапамогу калектывізацыі пеўняў.

Я, памятаю, адзін выпадак, калі тав. Малаковіч ехаў на зьезд і яму таварышы павінны былі прынесьці адпаведны матар'ялы. Адзін таварыш нёс яму лічбу, што ў акрузе калектывізавана 108 тысяч гэкт. зямлі, другі—220 тыс., а трэці кажа: «вазьмі мае лічбы—250 т. гэкт., а пакуль даедзеш да Менску, мы калектывізуем. Лічбы напалі сюды, і на падставе гэтых лічбаў рабілі вывады, і т. Гей прывёў крывую калектывізацыі, якая ўпала з 68 да 12 проц. з прычыны гэтых дутых канцылярскіх лічбаў.

Пару слоў аб гомельскіх памылак, аб якіх гаварыў т. Гей. Я лічу, што тав. Гею прыпісваюць дадаць нямнога. У Гомельскай арганізацыі, якою былі дапушчаны памылкі, характэрным зьяўляецца тое, што Гомельская арганізацыя змагла па-бальшавіцку перабудаваць на выпраўленьне дапушчаных памылак, калі мы мелі на працягу першага кварталу прарывы ў галіне выкананьня прамфінпляну, прарывы ў нашай партыйнай арганізацыі і прарывы не маленькія. Пасьля дырэктывы ЦК КП(б)Б Гомельская арганізацыя перабудавалася хутка і да 13 зьезду партыі яна прыйшла з ліквідацыяй сваіх прарываў, і, ня гледзячы на асобы, разгарнула шырокую бальшавіцкую самакрытыку.

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ

На ранішнім пасяджэньні 9 чэрвеня былі заслуханы даклады т. т. **Галадзеда і Рачыцкага** аб калгасным руху і ўздыме сельскай гаспадаркі.

У спрэчках па дакладах выступілі т. т. **Ахроменка, Кухаркін, Ярмолін, Дунец, Казлоўскі, Лабадзеў і Разумаў.**

На вячэрнім пасяджэньні ў спрэчках выступілі: т. т. **Балцін, Мышалаў, Дубіна, Калодка, Шпак, Качук, Міцькоў, Рашэтнікаў, Гарачун, Буйко, Азаронак, Славінскі і Масюкоў.**

У канцы пасяджэньня зьезд вітала дэлегацыя ад Барысаўскіх фабрык і заводаў.

Ад рабочых гуты імя **Домбаля** зьезд вітаў тав. **Сташкевіч**, ад фабрыкі **«Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская Перамога»** зьезд вітала тав. **Крупец**, ад фабрыкі **«Камінтэрн», Прафінтэрн» і імя Розы Люксембург**—тав. **Зордін**, ад чыгуначнікаў ст. Барысава —тав. **Сарока.**

З адказам на прывітаньні ад імя зьезду выступіў т. **Галадзед.**

Прамова тав. Чапёлкіна

Справаздачы ЦК КП(б)Б як палітычную, так і арганізацыйную, т. т. Гей і Васілевіч пабудавалі самакрытычна і адбівалі цалкам усю работу нашых партыйных арганізацый. Я цалкам далучаюся да тых таварышоў, якія ацанілі палітычную лінію ЦК правільнай. Адначасова я хачу спыніцца на тым, як мы пры правядзеньні калектывізацыі праводзім культмасавую работу сярод працоўных жанчын, асабліва на вёсцы.

Мы маем выпадкі, калі ў вёсцы ў часе пасэўнай кампаніі і калектывізацыі бяднячка і сераднячка выступала адкрыта супроць калектывізацыі, на што яна падштурхоўвалася в боку варожага элемэнту вёскі — кулака.

Такія моманты гавораць аб тым, што дрэнна пастаўлена выхаваньне працоўнай жанчыны вёскі. Мэтад рэарганізацыі жаночых аддзелаў зроблен добра, але дрэнна пастаўлена справа з укамплектаваньнем працаўнікаў на масавай рабоце ў сельскіх мясцовасьцях.

Мы ўпіраемся ў адзін факт — гэта ў падрыхтоўку кіруючых кадраў і кадраў па лініі прапаганды. У нас усе скончыўшыя навучальныя ўстановы—Камвуз, саўпартшколы — недастаткова прасоўваюцца на вёску. Мы маем цэлы рад выпадкаў, калі скончыўшыя асфакультэты і ўкруговых і цэнтральных установах і толькі маленькі процант праходзіць у раёны.

Мэліярацыйныя работы, якія праводзяцца па Беларусі, праходзяць без дастатковага вывучэньня, у якім напрамку павінна пайсьці і быць асвоена асушанае балота.

На Вабруйшчыне ёсьць Арэскі калфонд. На гэтым Арэскім калфондзе ўжо асушана некалькі тысяч гэкт. плошчы. Але мы да гэтага часу ня мелі поўнай устаноўкі, што мы павінны сеяць на гэтым балоце. Мы маем такое становішча: на паперы арганізавана навукова - дасьледчая станцыя — гэта пададдзел навукова - дасьледчага інстытуту імя Леніна, — на справе-ж яна там нічога не зрабіла. Адзяйі вялікі кавалак плошчы, разьбілі на вучастку, а ніякага вывучэньня не правялі, які напрамак павінен быць узяты, якія культуры павінны быць засеяны на гэтай плошчы.

Прамова тав. Чухмана

За пэрыяд ад XII зьезду КП(б)Б дабілася рашаючых посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Мы ведаем з матар'ялаў на дакладу тав. Гея лічбы, якія характарызуюць нашы посьпехі ў справе гаспадарчага будаўніцтва, калі валавая прадукцыя вырасла за 1928-29 г. на 44 проц., супроць 32 проц. у 1927-28 г., калі плян намечанага росту на 1929-30 г. складае 65 проц., а па рэспубліканскай прамысловасьці—47,5 проц.

Мы маем рост нашай гаспадаркі і па іншых лініях: па лініі электрыфікацыі, па лініі культурнага будаўніцтва і г. д. Гэтыя посьпехі былі дасягнуты дзякуючы таму, што КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, праводзіла правільную генэральную лінію нашай партыі, праводзіла сваю работу на аснове пастаноў XII зьезду партыі і на аснове пастановы XV зьезду УсеКП(б). Ня гледзячы на тыя труднасьці, якія мы мелі ў пэрыяд нашага будаўніцтва, усё-ж нам удалося гэтыя труднасьці перамагчы, партыя вяла і вядзе бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» загібамі, партыя за пэрыяд ад XII да XIII зьезду, асабліва на ўмовах беларускіх, вяла рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам.

Калі характарызаваць барацьбу ЦК партыі з нацыянал-дэмакратызмам усёй КП(б)Б за пэрыяд ад XII да XIII зьезду, дык мы можам яе характарызаваць, як пераломны пэрыяд у гэтай справе.

І ў сувязі з гэтым я хацеў-бы спыніцца на выступленьні тав. Аранштама. Я ўжо ня буду гаварыць адносна яго першых уводных слоў, адносна тэй групоўпчыны, аб якой ён казаў, я думаю, што калі гаворыць аб групоўпчыне, трэба выступіць з пэўнымі матар'ялямі і даказаць гэту групоўпчыну, каб зьезд сказаў сваё важкае слова ў гэтым пытаньні, але ўся прамова тав. Аранштама была цалкам навыстрыманая.

У чым яна заключаецца? Тав. Аранштам абвінавачвае ЦК у спуску на тармазох ў справе барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам. Я лічу, што гэта няправільна. Я кажу, што іменна ад XII да XIII зьезду партыі мы маем пераломны этап у справе барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам і адсюль тыя посьпехі КП(б)Б, якімі мы ўладаем, над нацыянал-дэмакратызмам, гэта датычыць тав. Жылуновіча, тав. Зарэцкага і, нарэшце, тав. Чарвякова, які выступіў на XII зьезьдзе партыі, хаця са спазьненьнем, але ўсё такі гэта пэўная работа КП(б)Б. Гэта пэўнае значэньне кіраўніцтва ЦК партыі, дзякуючы чаму дабіліся гэтых посьпехаў, прымусіўшы паасобных таварышоў прызнаць свае памылкі. Але мы маем гэта ня толькі ў гэтай справе, мы маем і ў адносінах барацьбы з прышчэпаўшчынай у Беларусі.

Я думаю што тав. Аранштам павінен будзе выступіць і сказаць па гэтым пытаньні і павінен адкрыта прызнаць сваю памылку на нашым партыйным зьезьдзе.

Наступнае пытаньне—адносна «Зьвязды». Я згодзен поўнасьцю з ацэнкаю тав. Гея ў тым, што «Зьвязда» правадзіла ў асноўным правільную лінію, правільную ацэнку даў ЦК работе «Зьвязды».

Я хацеў паставіць перад работнікамі «Зьвязды» пару такіх пытаньняў: ці любіць «Зьвязда» крытыку і ці прызнае яна сваячасова свае памылкі, ці выразна прызнае яна свае памылкі? Памойму, адказ у гэтай справе можа быць толькі адмоўны, што «Зьвязда» подалюблівае крытыку, што яна пры сваёй у асноўным правільнай палітычнай лініі, не заўсёды дае выразны і правільны адказ на ўсякія факты.

Пытаньне аб работніках «Зьвязды» новаму ЦК трэба будзе паставіць больш рэзка. Калі мы гаворым, што «Зьвязда» аўтарытэтны орган, калі мы гаворым, што трэба падняць аўтарытэт «Зьвязды» ва ўсёй нашай беларускай арганізацыі, дык трэба ўмацаваць «Зьвязду» работнікамі і гэтым самым падняць аўтарытэт «Зьвязды» на больш высокую ступень.

Ад рэдакцыйнай камісіі XIII зьезду КП(б)Б

Матар'ялы аб рабоце XIII зьезду КП(б)Б, апрача асобных дакладаў, зьмяшчаюцца ў друку ў скарочаным выглядзе.

Рэдакцыйная камісія.

Да XIII зьезду КП(б)Б

Вясна сацыялістычнай будоўлі ў сельскай гаспадарцы

Веснавая пасеўная кампанія бягучага году мае вялізарнае як палітычнае, так і гаспадарчае значэньне. З пасьпяховым яе правядзеньнем, пры поўным выкананьні ўсіх плянавых заданьняў—увесь працэс сацыялістычнага будаўніцтва набудзе вялізарнае падтрыманьне і штуршок да яшчэ большага паскарэньня тэмпаў нашага развіцьця.

Яравая кампанія бягучага году дасьць першае вытворчае афарміленьне і ўзмацненьне гістарычнага зруху бяднацка-серадняцкіх мас у бок калгасаў. Сацыялістычная перабудова вёскі стане на цьвёрдыя ногі. Веснавая сяўба сцэмэнтуе рэзультаты ўсёй нашай работы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У гэтым галоўнейшая і цэнтральная задача веснавой кампаніі. Дасягнуць рэзкага пашырэньня пасеўнай плошчы, дабіцца ўздыму ўраджайнасьці, намечанага плянам,—гэта азначае закласьці цьвёрды фундамант пад увесь наш калектыўны рух.

Вытворчае заданьне на веснавую пасеўную кампанію вызначана пастановай ураду БССР і зводзіцца да павялічэньня пасеўнай плошчы па яравых на 12,8 проц. і ўздыме ўраджайнасьці на 25 проц. Агульны разьмер пасеўнай плошчы павінен быць даведзен да 3.767.000 гэкт., супроць 3.509.000 гэкт. у мінулым годзе; яравы клін намечан плянам у 2.415.000 гэкт., супроць 2.156.000 гэкт. у мінулым годзе.

Тэмп росту паасобных культур характарызуецца наступнымі данымі: збожжавыя культуры павінны ўзрасьці на 1,5 проц., бульба—на 6,7 проц., тэхнічныя культуры—на 18,9 проц., травы—на 55 проц., плошча пад агародамі—на 9 проц. Пры агульным рэзкім павялічэньні разьмераў пасеўных плошчаў робіцца значны ўпор на яшчэ больш фарсаванае разьвіцьцё тэхнічных і кармавых культур, а таксама засеву траў.

Такое праектаваньне ў структуры засеву кліну абумоўлена неабходнасьцю максымальна магчымага павялічэньня і палепшэньня кармавой базы для жывёлагадоўлі, бо мінулы стан з кармамі ні ў якім выпадку нельга лічыць нармальным і яшчэ з большай нагрозай паўстае кармавое пытаньне ў сучасны момант, калі трэба, вырашаючы мяса-малочную праблему, браць больш высокія тэмпы ў разьвіцьці жывёлагадоўлі. Каб дасягнуць карэннага пералому ў разьвіцьці і павялічэньні гурту, ва ўмовах разгорнутай калектывізацыі сельскай гаспадаркі, неабходзен рашучы зрух і ў справе арганізацыі кармавой базы. Але трэба адзначыць, што яшчэ ня ўсімі зямельнымі органамі вразумета ўся важнасьць і патрэбнасьць вырашэньня кармавога пытаньня.

Агульны стан энэргаўзброенасьці сельскай гаспадаркі паказвае, што праграма веснавой сяўбы ня толькі можа быць выканана, але нават перавыкана, асабліва па сацыялістычным сэктары—саўгасах і калгасах. Бялянскі цягавай сілы як жывой, так і мэханічнай поўнасьцю забясьпечвае праграму пашырэньня пасеўнай плошчы. Колькасьць трактараў, ужо завезеных у

ВЫНІКІ САМАПРАВЕРКІ

Патрабуем паўторнай самаправеркі

на фабрыцы імя Валадарскага і на гуце „Камінтэрн“

На фабрыцы імя Валадарскага праверка праведзена фармальна, май даў прарыў у выкананьні прамфінпляну.— На гуце „Камінтэрн“ праверка змазана, май даў значнае паслабленьне тэмпаў работы

„ЦК УсеКП(б) лічыць, што ў большасьці раёнаў самаправерка была зусім невыстарчальна скарыстана для мабілізацыі рабочых мас, прафэсыянальных і гаспадарчых органаў на выкананьне пастаноў ЦК „Аб выніках ленінскага набору ўдарнікаў“.

...„У тых прадпрыемствах, дзе самаправерка прайшла фармальна, бяз удзелу рабочых мас і не стварыла пералому ў выкананьні прамфінпляну, зрабіць яе паўторна“.

(З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 1 чэрвеня).

Самаправерка—бяз усякіх вынікаў

Цэнтральным праўленьні саюзу прынікаў у некаторых адказных рабо[illegible]нікаў існуе думка, што на швейфабрыцы **імя Валадарскага ў Гілеве**, самаправерка выкананьня прамфінпляну і сацдагавораў прайшла дзіка нездавальняюча. Работнік саюзу, які падагульваў вынікі самаправеркі па ўсіх швейных прадпрыемствах, так і заяўляе, што ў вывадах самаправеркі па фабрыцы імя Валадарскага **амаль нічога канкрэтнага ня было.**

Гэта ацэнка будзе зразумелай, калі дадаць, што самаправерка на фабрыцы імя Валадарскага праходзіла **адначасова** са справаздачна-перавыборчай кампаніяй фабкому. Дзьве важнейшыя кампаніі, праведзеныя разам, перашкаджалі адна другой. Хоць у самаправачных брыгадах і было каля 90 добраахвотнікаў (з 600 рабочых), але **толькі на самаправерку ня была звернута патрэбная ўвага**, вынікі яе далі патрэбнага ўздыму і зьнішчэньня вытворчых недахопаў.

У часе самаправеркі ня была нават скарыстана тая акалічнасьць, што фабрыка ў красавіку некалькі зьнізіла ціны работы, даўшы 98,6 проц. выкананьня праграмы ў той час, як паўгадавая лічба паказвала 103 проц. Уважа рабочых ня была завострана на дзіўных бакох работы фабрыкі, па недастарчальным кіраўніцтве сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

І вось што атрымалася. Калі ў красавіку фабрыка выканала праграму на 98,6 проц., **дык у маі на фабрыцы значыўся буйны прарыў**—выкананьне вытворчай праграмы **толькі на 76 проц.**

Сама адміністрацыя схільна тлумачыць прарыў аб'ектыўнымі прычынамі. Па-першае, нельга пашырыць цэхі, няма месца, па-другое ў адным з асноўных цэхаў—цэху па вырабе пальтаў, ня было поўнага камплекту рабочых, па-трэцяе, быў узят курс на паляпшэньне якасьці прадукцыі за кошт сьвядомага памяншэньня кольькасьці і т. д. Мы ўжо не гаворым аб правільнасьці апошняй устаноўкі — паляпшаць якасьць за кошт колькасьці. Трэ' было знайсьці іншыя шляхі да паляпшэньня якасьці прадукцыі, у гаватнасьці ўзмацніць сацспаборніцтва ў гэтым напрамку. Але, як мы ўжо сказалі вышэй, **на сацспаборніцтва была зьвернута патрэбная ўвага.**

Асноўнымі прычынамі прарыву зьяўляюцца **шматлікія вытворчыя недахопы**, якія **ня зьнішчыла самаправерка**, таксама адсутнасьць належнага кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

У цэхах слаба адчуваецца кіраўніцтва адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. З гэтае прычыны ў цэхах здараюцца вялікія заторы прадукцыі. Адны цэх на віпе дырэктыву сапсаваў шэсьць 1.000 падкладак. Прэсы халодныя, прасавальшчыкі кожны дзень маюць вялікія прастоі. З гэтае прычыны ў прасавальным цэху таксама частыя заторы, якія даходзяць аж да тысячы польтаў. У работе закройнага цэху—шмат недахопаў. Бываюць выпадкі, калі закройная, накіроўваючы прыкроеныя польты і паўпольты ў наступны цэх, так заблытае асобныя часткі паліта, што цяжка разабрацца. Напрыклад, сьпінкі паліта 46 разьмеру ўкладваліся разам з пачкамі 52 разьмеру, або паадварот. Тое самае з рукавамі. **На няўважлівыя адносіны рабочых закройнай ніхто не зварачае ўвагі** і нават старшыня вытворчай нарады адносіцца да гэтага прыпэрэнча.

Аб адсутнасьці кіраўніцтва ўдарным рухам сьведчыць наступны факт. Да часу ленінскага прызыву ўдарнікаў на фабрыцы імя Валадарскага ўдарны рух адчуваўся вельмі слаба. Можна сказаць, што на фабрыцы зусім ударнікаў і ня было. У часе ленінскага прызыву амаль усе рабочыя абвясьцілі сябе ўдарнікамі. І калі больш сьвядомая група рабочых сапраўды перайшла на ўдарныя тэмпы, значная частка прыняла ўдарніцтва, як пойкую фармальнасьць. А з боку фабкому ня было адпаведнай растлумачальнай работы, ня было адпаведнага кіраўніцтва.

Да Магілеўскай акруговай канфэрэнцыі (22 мая) фабрыка імя Валадарскага абвясьціла сябе ўдарнай, **хаця ніякіх падстаў для гэтага ня было.** На фабрыцы ў той час ужо вызначыўся прарыў, які гаварыў аб ня зусім ударных тэмпах работы.

А 30 мая зноў 110 рабочых абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя партыйных зьездаў і арганізавалі 7 ударных брыгад. Такім чынам, мы даведаліся, што на «ўдарнай» фабрыцы 110 рабочых не зьяўляліся яшчэ ўдарнікамі. **Ці давала гэта права фабрыцы тыднем раней назваць сябе ўдарнай?**

Усё гэта яшчэ раз пацьвярджае **адсутнасьць выразнага кіраўніцтва з боку фабрычных арганізацый ударным рухам.**

Самаправерка ня зьнішчыла ўсіх гэтых недахопаў, не дапамагла больш выразнай пастаноўцы пытаньняў аб ударніцтве і сацспаборніцтве, не зрабіла патрэбнага пералому ў выкананьні прамфінпляну.

Але, ня гледзячы на тое, што работнікі ЦП саюзу прызнаюць нездавальняючае правядзеньне самаправеркі, **ніхто не падумае аб выпраўленьні гэтай памылкі,** ніхто не прапануе зрабіць **паўторную самаправерку** выкананьня прамфінпляну, сацспаборніцтва з мэтай сапраўднай мабілізацыі мас за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Фабрыка імя Валадарскага павінна быць адным з тых прадпрыемстваў, дзе дырэктыву ЦК УсеКП(б) аб паўторнай самаправеркі трэба абавязкова правесьці ў жыцьцё. **В.**

Змазалі важнейшую кампанію

Як вядома, згодна першай дырэктывы УсеЦСПС, самаправерка сацспаборніцтва павінна была быць праведзена на працягу красавіка. Потым у працэсе самаправеркі вызначылася, што многія прадпрыемствы не пасьпяваюць да гадавіны сацспаборніцтва (29 красавіка) закончыць самаправерку. Тады канчатковы тэрмін самаправеркі быў працягнут. Пытаньне было пастаўлена так, **што лепш крыху зацягнуць самаправерку,** толькі-б ня не скамячыць, не закончыць насьпех, **без рэальных вынікаў** для работы прадпрыемства, сацспаборніцтва і ўдарнага руху.

На гуце «Камінтэрн» **гэтага не зразумелі.** Самаправерка была праведзена «кавалерыйскім наскокам». 3-га красавіка агульна - зьменавы сход пастанавіў стварыць ударныя брыгады для праверкі сацдагавораў, прычым заўкому было даручана выпрацаваць плян правядзеньня «месячніка сацспаборніцтва». Характэрна, што заўком да гэтага сходу **не падрыхтаваўся** і прышоў на сход нават бяз пляну правядзеньня самаправеркі. Больш таго, заўком не зразумеў новых форм і мэтадаў прафработы, у прыватнасьці, самаправеркі і паставіў пытаньне **не аб вярбоўцы добраахвотнікаў** у самаправарачныя брыгады, а **аб выбары іх.**

5 дзён заўком выпрацоўваў плян самаправеркі. 8 красавіка агульна-зьменавы сход на прапанове старшыні заўкому тав. **Барданоўскага** выбраў (!) 45 удзельнікаў самаправачных брыгад. Прычым прапанаваў заўкому належным чынам праінструктаваць праверачныя брыгады і выдаць на рукі канкрэтныя заданьні кожнаму брыгадзіру пасобку.

Брыгады ня былі даволі праінструктаваны. Таму яшчэ праз 5 дзён, 13-га красавіка, вытворчая нарада прымушана была адзначыць, што самаправерка амаль **ня зрушылася з месца.** Шырокія масы рабочых у самаправерку **ня былі ўцягнуты.** З 523 рабочых у самаправерцы акрамя 45 добраахвотнікаў ніхто ня прымаў удзелу. Самаправерка праходзіла міма прафарганізацыі, **міма прафуповноважаных цэхаў.** Насьценгазэта маўчала, брыгады ходу самаправеркі не асьвятлялі. Адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал стаяў у баку.

Вытворчая нарада дала некалькі паказаньняў агульнага характару і гэтым уся дапамога самаправачным брыгадам абмежавалася.

Прайшло яшчэ два тыдні. Праўда, за такі час можна зрабіць шмат. Але, судзячы па вывадах самаправачных брыгад, яны ва гэтыя два тыдні таксама мала чаго пасьпелі. 26 красавіка агульна - зьменавы сход ужо слухаў вынікі работы самаправачных брыгад. Сход з вынікамі згадзіўся, але ў гэтых выніках амаль нічога ня было аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Самаправачныя брыгады абмежаваліся паступнай характарыстыкай: «у сацыялістычнае спаборніцтва ўцягнуты ўсе рабочыя, паміж зьменамі і варштатамі заключаны сацдагаворы, але выкананьне сацдагавораў дрэннае, працдысцыпліна адчуваецца мала». Вось усё, што здолелі сказаць самаправачныя брыгады аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Праўда, у вывадах ёсьць паказаньне аб трох дзесятках вытворчых недахопаў. Гэта таксама важна, але гэтым нельга было абмежавацца, робячы вывады аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Вось калі выразна выявілася адсутнасьць належнага кіраўніцтва самаправеркай з боку заўкому.

Трэба сказаць, што некаторае супакаеньне ўнесьлі лічбы выкананьня прамфінпляну. Вытворчая праграма за першае паўгодзьдзе на заводзе выканана на 123,7 проц. па вазе і на 102 проц. паштучна. Сабекошт зьніжан на 9,11 проц. замест 7,14 проц. паводле пляну. Гэтыя лічбы і прывялі да «галавакружэньня ад посьпехаў». Самаправачныя брыгады і заводзкія арганізацыі ня лічылі патрэбным завастрыць увагу рабочых на выкананьне прамфінпляну, ігнаруючы, напрыклад, такое пытаньне, як прагулы, якіх усё-ж за паўгодзьдзе было 96 чалавека-дзён.

Настрої кіраўнікоў адбіліся некаторым чынам і на настроях рабочых.

У МАІ ЗАВОД ПРАЦАВАЎ УЖО БОЛЬШ СЛАБЫМІ ТЭМПАМІ, чым, напрыклад, у красавіку. Калі ў красавіку праграма была выканана па вазе на 131 проц. і ў ценнасным азначэньні на 122,5 проц., дык у маі праграма выканана **на 118,9 проц. па вазе і на 103,8 проц. у ценнасным азначэньні.** Такім чынам, мы ясна бачым **значнае паслабленьне тэмпаў работы,** хоць вытворчая праграма, як і раней, перавыконваецца. Між тым, самаправерка павінна была прывесьці да адваротных вынікаў — **яшчэ большага ўзмацненьня тэмпаў работы.**

Усе гэтыя даныя прымушаюць зрабіць вывад, што **самаправерка на заводзе «Камінтэрн» была змазана,** што самаправерка не дала патрэбных рэальных рэзультатаў.

ЦП саюзу хэмікаў павінна вырашыць пытаньне—ці ня метазгодна зараз правесьці паўторную самаправерку з мэтай —сапраўды навучыць заводзкія арганізацыі кіраваць сацспаборніцтвам і ўдарным рухам з мэтай сапраўднай мабілізацыі ўвагі ўсяго рабочага калектыву на ажыцьцяўленьне пяцігодкі за 4 гады.

С—к.

Лён--пагражаючы вучастак пасеўнага фронту

Віцебская і Полацкая акругі не дабіліся пералому

Тэрміны сяўбы канчаюцца. Напружыць усе сілы і сродкі на поўнае выкананьне пасеўных плянаў

На чорную дошку за ганебныя тэмпы

Апошнімі днямі мы адзначалі зусім нездавальняючы тэмп сяўбы ільну ў Полацкай акрузе, самай ільнаводнай у БССР. Праўда, апошняя пяцідзёўка дае павялічэньне зсеянай ільном плошчы, але яшчэ ня сьведчыць аб рашаючым пераломе, які-б гарантаваў поўнае выкананьне пляну.

У «Чырвонай Полаччыне» ад 7-га чэрвеня мы знаходзім падрабязныя весткі аб ходзе сяўбы ільну па асобных раёнах. Аказваецца, што некаторыя раёны зусім недапушчальна адстаюць ад тэмпу сяўбы на акрузе ў цэлым. Напрыклад, на 1-га чэрвеня калгасы Полацкага раёну выканалі толькі 3,3 проц. пляну, а індывідуальны сэктар—4,4 проц. Расонскі раён по адстаў ад Полацкага. Калгасы Расончыны далі 6,6 проц. пляну, індывідуальнікі—8,9 проц.

Зусім заслужана Полацкі і Расонскі раёны за ганебна павольны тэмп сяўбы ільну запісаны «Чырвонай Полаччынай» на чорную дошку. На колькі адстаюць гэтыя раёны яскрава сьведчаць абсалютныя лікі. Полацкі раён павінен паводле пляну засеяць 2758 гэкт., засеяў-жа ён 119 гэкт. Расонскі раён замест 3.460 гэкт. засеяў—293 гэкт.

Кандыдатам на чорную дошку абвешчаны Боркавіцкі раён, калгасы якога замест 1.132 гэкт. засеялі ўсяго 138 гэкт.

Неабходна адзначыць, што Расонскі раён—самы ільнаводны ва ўсёй Полаччыне.

«Чырвоная Полаччына» цалкам сьцьвярджае нашу думку аб тым, што кіраўніцтва сяўбой у Полаччыне не наладжана. Акрпаляводсаюз, напрыклад, зусім ня цікавіцца ходам сяўбы. Ніякай актыўнасьці не выяўляе ні акрвыканком, ні плянавая камісія.

Полаччыне трэба напружыць усе сілы, каб па-бальшавіцку выканаць плян сяўбы ільну.

Віцебшчына аслабіла тэмп

Віцебская акруга, культура ільну ў якой займае значнае месца, па 5-га чэрвеня выканала плян сяўбы ільну—па 45,8 проц., па каноплях — на 24,4 проц.

За пяцідзёўку дасягнута павялічэньне па ільне толькі — на 6 проц., па каноплях — на 4 проц. Моцна адстаюць з сяўбой ільну індывідуальнікі — 44,6 проц. супроць — 53,7 проц., якія далі калгасы. Вялізарная разьбежка маецца па каноплях. Індывідуальны сэктар даў усяго — 21,9 проц. пляну, у той час, як калгасы выканалі — 84 проц. пляну.

У мінулую пяцідзёўку акруга дала павялічэньне па ільне, прыблізна,—на 15 проц., а па каноплях — на 6 проц. Такім чынам тэмп сяўбы тэхкультур у Віцебшчыне за апошнюю пяцідзёўку ня толькі не павысіўся, а нават пагражаюча зьнізіўся ў параўнаньні з мінулай пяцідзёўкай.

Характэрна, што калгасы па збожжавых культурах ужо выканалі 100,7 проц. пляну. Гэта вялікае дасягненьне. Але побач з гэтым весткі з месц гавораць аб палуўнасьці неразуменьня нават калгасамі вялізарнага значэньня сяўбы тэхкультур. Тыя особныя спробы засіваньня за лік працаёмкіх культур, больш лёгкія — зернявыя.

У нас яшчэ няма падрабязных даных, якія характарызуюць дакладны ход сяўбы па Віцебшчыне і з гэтае прычыны ня можам паказаць, якія абставіны выклікалі паслабленьне тэмпу сяўбы тэхкультур. Узьнікае небясьпека, што месцы, дабіўшыся ў мінулай пяцідзёўцы некаторага зруху, па гэтым супакояцца.

Віцебская акруга павінна выканаць плян пасеўнай кампаніі поўнасьцю ня толькі па зернявых культурах, але і па тэхнічных.

Тэрміны для сяўбы канчаюцца.

На 5-га чэрвеня калгасамі Віцебскай акругі засеяна 33.487 гэкт., што складае 89,5 проц. пасеўнага пляну калгасаў. Індывідуальным сэктарам засеяна 161.806 гэкт. — 75,5 проц. Усяго па абодвых сэктарах засеяна 195.293 гэкт., або 77,6 проц. агульнага пасеўнага пляну.

Пад збожжавыя культуры засеяна калгасамі 16.823 гэкт. (100,7 проц. пляну), індывідуальным сэктарам — 86.859 гэкт. (85,8 проц.), усяго па абодвых сэктарах — 103.682 гэкт. (87,9 проц.).

Па бульбе калгасы далі 72,6 проц. пляну, індыв. сэкт. — 92,1 проц.; па кораньплодах: калгасы — 57,4 проц., індыв. сэктар — 13,7 проц.

У сярэднім па абодвых сэктарах плян выкананы: на бульбе — на 89,3 проц., кораньплодах — на 18,3 проц., віцы на насеньне — на 107,7 проц., віцы на сена — на 68,2 проц., канюшыне — на 90,6 проц., гароднім культурах — на 71,6 проц. і іншых яравых культурах — на 13,1 проц.

НАСЕНЬНЕ САЎГАСУ ІМЯ 10-ЦІГОДЗЬДЗЯ БССР ЯШЧЭ НЕ АДГРУЖАНА

Тэрмінова прыняць належныя меры

Паводле вестак, якія маюцца ў Наркамземе БССР, ад замаразкаў пацярпелі толькі гароднія культуры. Пасевы ярыны і іншых культур нідзе не папсаваны. Выключэньнем зьяляецца саўгас імя 10-цігодзьдзя БССР, які знаходзіцца на Мар'інскім масыве. Ільнапяньковае аб'яднаньне атрымала ад кіраўніка саўгасу тэлеграму, што ад замаразкаў моцна пацярпелі ўсходы ўсіх культур на 90 проц.

Перасеву падлягаюць 600 гэкт., з якіх 250 гэкт. поўнасьцю і 350 гэкт. часткова. Белпаляводсаюзу дадзены нарад на дастаўку ў саўгас імя 10-цігодзьдзя БССР насеньня наступных культур: віко—8.000 кілгр., аўсу—8.000 кілгр., палавіцы белай—300 кілгр., аўсяніцы лугавой—1.000 кілгр., цімафееўкі—600 кілгр., канюшыны—600 кілгр., ежы зборнай—600 кілгр. і мятлюку лугавога—200 кілгр.

Белпаляводсаюз з свайго боку адда распараджэньне выканаць радзнарады Віцебскаму, Бабруйскаму і Аршанскаму акрпаляводсаюзам яшчэ пазаўчора.

Ня гледзячы на тое, што заданьне г тае носіць звыштэрміновы характа бо сяўба ўжо канчаецца ў БССР, а ўм вы дастаўкі насеньня ў саўгас вельмі цяжкія, азначаныя акрпаляводсаюзы яго яшчэ ня выканалі.

Апэрацыйныя зводкі

Полацкая акруга—77,2 проц.

ПОЛАЦАК. Калгасы Полацкай акругі па 5-га чэрвеня выканалі 89,2 проц. свайго пасеўнага пляну—засеяпа—29.378 гэкт. Індывідуальным сэктарам засеяна 92.863 гэкт.—74,1 проц. пляну. Усяго па акрузе засеяна 122,241 гэкт., што складае **77,2 проц. агульнага пасеўнага пляну.**

Процант выкананьня пляну сяўбы тэхнічных культур не вялікі. Калгасамі плян выкананы на 43,3 проц., індывідуальным сэктарам—на 37,2 проц., у сярэднім па акрузе—на 38,5 проц. На ільне калгасы далі—43,2 проц. пляну, індыв. сэктар—37 проц., у сярэднім—38,3 проц.; па каноплях: калгасы—54,1 проц., індыв. сэктар—51,4 проц., у сярэднім—51,8 проц.

Пад збожжавыя культуры засеяна ўсяго—67.147 гэкт., або 86,1 проц. пляну.

Па бульбе калгасы выканалі—79,4 проц. пляну, індыв. сэктар—89,9 проц., па кораньплодах—калгасы—45,9 проц., індыв. сэктар—24,4 проц.

У сярэднім па абодвых сэктарах плян выкананы па бульбе--на 88 проц. кораньплодах—на 32 проц., віцы на насеньне—на 131,3% віцы на сена—на 65,9 проц., сэрадэлі—на 72,2 проц., канюшыне—на 72 проц., лубіне—на 16,5%, гароднім культурах—на 94 проц. і іншых яравых культурах—на 96,1 проц.

Магілеўская акруга—82,4 проц.

МАГІЛЕЎ. Па Магілеўскай акрузе на 5-га чэрвеня засеяна 367.097 гэкт.—82,4 проц. агульнага пасеўнага пляну. Калгасамі засеяна 62.657 гэкт. (71,8 проц. пляну), індыв. сэктарам—304.440 гэкт. (84,9 проц.).

Па збожжавых культурах плян у сярэднім выкананы—па 77,2 проц. Засеяна 196.379 гэкт.: калгасамі—32,755 гэкт. (76,4 проц.), індыв. сэктарам—163.624 гэкт. (77,3 проц.).

Па тэхнічных культурах калгасы выканалі—62,7 проц. пляну, індыв. сэктар—68,4 проц., у сярэднім—67,6 проц. Па ільне калгасы далі—71,3 проц. індыв. сэктар—77,9 проц.; па каноплях: калгасы—26,6 проц. індыв. сэктар—34,4 проц. У сярэднім плян выкананы па ільне—па 77 проц., па каноплях—на 33,4 проц.,

Па бульбе—калгасы выканалі—70,1 проц., індыв. сэктар—111 проц.; па кораньплодах: калгасы—18,7 проц., індыв. сэктар—9,1 проц.

У сярэднім абодва сэктары далі па бульбе—102,7 проц. пляну, кораньплодах—11,3 проц., віцы на насеньне—81,8 проц., віцы на сена—96,4 проц., сэрадэлі—16,6 проц., канюшыне—69,4 проц., лубіне—41 проц., гароднім культурах—107 проц., сіласных культурах—10,8 проц.

Гомельская акруга—89,2 проц.

ГОМЕЛЬ. На 5-га чэрвеня па Гомельскай акрузе засеяна ўсяго 223.651,5 гэкт., што складае—89,2 проц. агульнага пасеўнага пляну. Калгасы засеялі 41.475,5 гэкт. (88,5 проц. пляну), індыв. сэктар 182.176 гэкт. (89,3 проц.).

Усяго пад збожжавыя культуры засеяна—107.254 гэкт., або 86,9 проц. пляну, пры чым калгасы далі—93,7 проц. свайго пляну, індыв. сэктар—85,5 проц.

Па ільне калгасы выканалі—82,6 проц., індыв. сэктар—83,4 проц. у сярэднім—83,3 проц.; па каноплях: калгасы—64,3 проц., індыв. сэктар—65,9 проц., у сярэднім—65,6 проц. У сярэднім па тэхнічных культурах плян выкананы калгасамі—на 81 проц. індыв. сэктарам—на 81,8 проц., абодвума сэктарамі—на 81,6 проц.

Па бульбе: калгасы выканалі 79 проц. пляну, індыв. сэктар—103,8 проц.; кораньплодах: калгасы—72,7 проц., індыв. сэктар—60 проц.

У сярэднім па абодвых сэктарах плян выкананы: па бульбе—на 99,8 проц., кораньплодах—на 66,2 проц., віцы на насеньне—на 100,7 проц., віцы на сена—на 96,8 сэрадэлі—на 22,1 проц., канюшыне—на 81,3 проц. лубіне—на 50,1 проц., гароднім культурах—на 81,6 проц., сіласных культурах—на 15,1 проц. і іншых яравых культурах—на 37,7 проц.

Пашырэньне Бабруйскага ліцейнага заводу

БАБРУЙСК. (Наш. кар.). З 26-га мая ліцейны цэх Бабруйскага чыгуна-ліцейнага заводу перайшоў на 3 зьмены, што значна павялічыць выпуск прадукцыі. Прыбыла група кваліфікаваных фармоўшчыкаў. Для працы ў ліцейным цэху перакваліфікуецца 12 чорнарабочых.

Пабудова 25 новых цагелень

МАЗЫР. (Наш. кар.). У сёлетнім будаўнічым сэзоне на Мазырыншчыне распачата пабудова 25 новых цагелень згадовай выпрацоўкай 7.100 тыс. штук цэглы. Вядзецца таксама пабудова чарапічнага і вапнянага заводаў.

У сувязі з новым будаўніцтвам выпрацоўка цэглы, у параўнаньні з мінулым годам, павялічыцца у акрузе на 300 проц., чарапіцы — на 200 і вапны—на 100 проц.

Антысэміцкая вылазка ў вагонных майстэрнях чыгункі

Што пастанавіла бюро Кастрычніцкага РК КП(б)Б

У свой час «Зьвязда» сыгналізавала аб антысэміцкіх вылазках у Менскіх вагонных майстэрнях МВБ чыгункі. Група антысэмітаў сыстэматычна зьдзекавалася з рабочага-яўрэя Гелера. Зьзекваліся ня толькі з тав. Гелера, цкавалі і іншых рабочых-яўрэяў. Камуністы Комша зрабіў нагалы антысэміцкі выпад супроць партыйца тав. Міленькага.

Ні парт'ячэйка, ні мясцком у той час не рэагавалі належным чынам на антысэміцкія выпадкі.

Пастанова мясцкому аб абмеркаваньні на агульным сходзе рабочых аб фактах антысэмітызму так і засталася пастановай. Больш 8 месяцаў гэта пытаньне не абмяркоўвалася на рабочым сходзе. Пытаньне аб нагным антысэміцкім выпадзе супроць партыйца Міленькага разглядалася на бюро ячэйкі, пастанова якога была падобна больш на анэкдот, чым на сапраўднасьць. Бюро ячэйкі ўхваліла паставіць на від і т. Комшу і т. Міленькаму, хаця апошні зьяўляўся пацярпеўшым. Больш таго, камсамольца Міхэдку, які першы пачаў зьдзекавацца з Гелера... вылучылі на больш адказную работу манцёра.

Раённы камітэт партыі даў належную палітычную ацэнку фактам, якія мелі месца ў вагонных майстэрнях. РК зрабіў рад арганізацыйных вывадаў: было распушчана бюро ячэйкі вагонных майстэрань, распушчана бюро камсамольскай ячэйкі і мясцком. Але належнай растлумачальнай работы вакол фактаў антысэміцкіх выпадкаў ня было праведзена.

На глебе гэтай агіднейшай бязьдзейнасьці факты антысэмітызму за апошні час у вагонных майстэрнях выліліся ў грубыя антысэміцкія зьдзекі.

Факты, меўшыя месца ў маі і чэрвені месяцах гэтага году — зьдзекі з рабочага майстэрань Залмановіча, штурханьне яго іры пераходзе ў майстэрні, абдзіраньне яго вадой, збойства яго рабочым Бальковічам, штурханьне Залмановіча на гарачае жалеза рабочым Лісенка і г. д. — усе гэтыя факты носяць злосны, антысэміцкі контррэвалюцыйны характар.

Як-жа на гэты раз аднеслася парт'ячэйка, прафарганізацыя да гэтых агіднейшых фактаў?

Сакратар парт'ячэйкі вагонных майстэрань тав. Паўлавец адцёсься нядбайна да заявы Залмановіча аб яго збойстве—сакратар ячэйкі, ня чытаючы, падпісаў гэту заяву «да ячэйкавых спраў». Гэта паслужыла поводам да яшчэ большага наглыбленьня антысэмітызму. 5-га чэрвеня рабочы Лысенка штурхнуў Залмановіча на гарачае жалеза, ад чаго Залмановіч, упаўшы, прапаліў верхнюю вопратку. Камуністыя-ж, якія працуюць у кавальскім правіл антысэмітызму. Не рэагавалі камуністыя і на тыя настрої, якія мелі месца сярод паасобных больш адсталых рабочых. Гэтыя настрої зводзіліся да таго, што быццам-бы партыя праводзіць няправільную нацыянальную палітыку, што рабочых-яўрэяў трэба ставіць на работу асобна.

Фракцыя МК, разглядаючы антысэміцкія выпадкі, дапусьціла яшчэ большую грубую палітычную памылку. **Яна абвясьціла вымову рабочаму Залмановічу за тое, што ён быццам-бы прымірэнча адносіўся да антысэміцкіх выпадаў, якія ўжываліся да яго.** Агульны партсход таксама дапусьціў палітычную памылку — не асудзіў такую пастанову фракцыі, а абмежаваўся прапановай фракцыі перагледзець пастанову аб вынесьненьні вымовы рабочаму Залмановічу.

* * *

Бюро Кастрычніцкага райкому КП(б)Б, разгледзеўшы гэту справу, вынесла адпаведную пастанову. **Яно прапанавала бюро парт'ячэйкі тэрмінова склікаць агульны сход рабочых, дзе паставіць пытаньне аб фактах антысэмітызму, стварыўшы навакол гэтых фактаў грамадзкую думку, прыняўшы рашучыя меры да антысэмітаў, перадаўшы справу ў пракуратуру. Партколектыву вузла запрапанавана пытаньне аб фактах антысэмітызму тэрмінова паставіць на агульных сходах усяго вузла, тэрмінова правесьці на сходах усіх парт'ячэек вынікі і прапановы акругкому па дасьледваньні вузла, узмацніць работу сярод рабочых па растлумачэньні сутнасьці нацыянальнай палітыкі партыі і савецкай улады, разгарнуць рашучую барацьбу з праявамі антысэмітызму і шавінізму розных колераў.**

Бюро РК вынесла пастанову аб узмацненьні кіраўніцтва парт'ячэйкі шляхам прымацаваньня да ячэйкі вагонных майстэрань палітычна - падрыхтаваных таварышоў з раённага актыву, паставіла пытаньне перад бюро АК КП(б)Б аб узмацненьні прафсаюзнай масавай работы па Менскім вузьле з боку Белбюро ЦК чыгуначнікаў.

Сакратару парт'ячэйкі тав. Паўлаўцу за нядбайныя адносіны да паданай заявы тав. Залмановічам аб антысэміцкіх выпадках, за блізарукія і нядбайныя адносіны да настрояў сярод рабочых, фактаў антысэмітызму, за няўжыцьцё належных мер для правядзеньня партыйна - масавай, прафсаюзнай работы, работы па інтэрнацыянальным выхаваньні і правядзеньні рашучай барацьбы з праявамі антысэмітызму — абвешчана вымова. Таксама ён зьнят з пасады сакратара бюро ячэйкі і выведзен са складу бюро ячэйкі.

Бюро парт'ячэйкі майстэрань, хаця апошняя працавала кароткі тэрмін, але належных і своячасных мер да ўліку настрояў рабочых, меўшых месца фактаў антысэмітызму і пастаноўкі партыйна-масавай прафсаюзнай, інтэрнацыянальна - выхаваўчай работы сярод рабочых не прыняла і не мабілізавала ўвагу партыйных і рабочых мас вакол выкананьня пастановы райкому ад 22-XII 29 г. — паставіла яму на від.

Фракцыі МК за зусім спабую пастаноўку прафсаюзнай масавай работы і работы па інтэрнацыянальным выхаваньні таксама пастаўлена на від.

Работы калектыў вагонных майстэрань чыгункі дасьць належны рашучы адпор вылазкам антысэмітызму — гэтай зброі кляснага ворага, які імкнецца сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва.

С.

Падрыхтоўка да хлебазагатоўчай кампаніі фактычна не пачата

МАРУДНАСЬЦЬ У ГЭТАЙ ВАЖНАЙ СПРАВЕ АБСАЛЮТНА НЕЦЯРПІМА

ДАБ'ЕМСЯ БАЯВЫХ УДАРНЫХ ТЭМПАЎ!

Хлебазагатоўчая кампанія ў гэтым годзе набывае выключна важнае значэньне, гарантуючы выкананьне пляну спажывецкага забесьпячэньня і забясьпячэньня пасьпяховасьці сацыялістычнага будаўніцтва другога і трэцяга гадоў пяцігодкі. Загатоўкі павінны зрабіць магутным вагаром стымуляваньня шпаркага ўздыму сельска-гаспадарчай базы, узмацненьня вытворчай сьмычкі гораду і сяла на новым рэканструкцыйным этапе. Менавіта таму ўвага партыі, усе сілы ўсіх загатовых арганізацый, дапамога ўсёй пролетарскай грамадзкасьці павінны быць накіраваны ў бок максымальнай зрэйнасьці складанай і цяжкай справы загатоўчай кампаніі,—так характарызуе значэньне хлебазагатоўчай кампаніі ў гэтым годзе наркамгандлю БССР тав. **Мікаян.**

Рэдакцыя зацікавілася тым, як ідзе падрыхтоўка да хлебазагатоўчай кампаніі па Савецкай Беларусі. Мы азнаёміся з работай раду зацікаўленых арганізацый. На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што сапраўдная падрыхтоўчай работы да хлебазагатовак пачаць яшчэ няма, хаця гэта работа павінна была распачацца ўжо даўно.

Беларуская кантора Саюзхлеба, як паўны распарадчык хлебам, павінна была аслабаніць аддаленыя хлебныя склады ад лішніх запасаў хлеба і падрыхтаваць іх для гарадоў з тым, каб падрыхтаваць склады да новай хлебазагатовай кампаніі, каб іх можна было ў часова ачысьціць, прадэзынфэкцыраваць, адрамантаваць. Але работа па ачыстцы аддаленых складаў ад лішкаў збожжавых запасаў Саюзхлебам ня робіцца і ва ўсякім выпадку, робіцца вельмі вяла і марудна.

У гэтым годзе мы будзем мець вялікае будаўніцтва новых хлебных складаў. **Павінны быць пабудаваны сотні новых складаў ёмкасьцю ў некалькі мільёнаў пудоў хлеба.** Але падрыхтоўчая работа да будаўніцтва вядзецца вельмі слаба, у большасьці выпадкаў яшчэ нават ня выяўлены месцы для пабудоў.

Вялікую ролю ў хлебазагатоўчай кампаніі адыгрывае **выстарчальнае забесьпячэньне тарай.** Беларуская кантора Саюзхлеба паслала ў Маскву заяўку на 400.000 новых мяшкоў для хлеба. Але мы, зразумела, ня можм абмежавацца аднэй дапамогай цэнтру, які ня можа ў поўнай меры забясьпечыць нашы патрэбы ў тары. І нам неабходна **мабілізаваць усю ўнутраную наяўнасьць тары і рамантаваць старую тару.** Але гэта работа ня рухаецца з месца. Белкаапсаюз, яшчэ не пачаў работы па ўліку наяўнасьці тары, якая ёсьць у нізоўцы. Кожная арганізацыя, якая бярэ хлеб у Саюзхлебе, абавязуецца ў вызначаны тэрмін вярнуць хлебныя мяшкі, але зварот гэтай тары ідзе вельмі туга. І тут назьбіралася вялікая запазычанасьць. Праўда, і пасылка кантора Саюзхлеба, якіх, які сяк, заданьня з Масквы, абмэтаваў, на вялікая двухтыднёвік па та мела мало [illegible] гэты двухтыднёвік дрэнна арганізаваны, бяз прыцягненьня да яго грамадзкай думкі, прайшоў з даволі сумнымі вынікамі. Гэты двухтыднёвік працягнуты да 15-га чэрвеня—і гэту вельмі важную справу трэ' будзе пасунуць уперад і дабіцца эфэктыўных вынікаў. Праведзеная ў нас чыстка каапэрацыйнага апарату паказала вялікую засьмечанасьць радоў загатоўшчыкаў сацыяльна-чужымі і варожымі нам элемэнтамі. Зараз нам трэба папоўніць апарат загатоўшчыкаў новымі, **нашымі** людзьмі, пераважна з асяродзішча бядняцка-серадняцкага актыву. Але гэтых новых людзей трэба папярэдня азнаёміць з іх будучай адказнай работай, прапусьціць іх праз спецыяльныя, хаця-б кароткатэрміновыя, курсы. Але фактычна гэта работа яшчэ не праводзіцца, яна толькі вызначана ў пляне работ нашых каапэрацыйных сыстэм—а між тым час ня церпіць.

Трэба яшчэ паказаць на **кантрактацыю збожжавых культур,** цесна зьвязаную з хлебазагатоўкамі—чым больш у нас будзе заключана дагавораў па кантрактацыі, тым лепш у нас пройдуць хлебазагатоўкі. На жаль прыходзіцца адзначыць, што **размер кантрактацыі збожжавых культур у нас вельмі нізкі.**—Выкананьне пляну кантрактацыі па жыце на першае чэрвеня складае 24 проц. і па іншых збожжавых культурах—37 проц. Работа па кантрактацыі ў нас у гэтым годзе працягнута да ўборкі ўраджаю і неабходна прылажыць усе намаганьні, каб поўнась

Звыш 9 млн. р.—на гаспадарчае ўпарадкаваньне бядняцкага насельніцтва мястэчак

33 тыс. бядняцкіх сямей уцягнуты ў вытворчую працу

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР адзначае:

1. Работа па гаспадарчым упарадкаваньні бядняцкага насельніцтва мястэчак гарадзкога тыпу, якая праводзілася на падставе пастановы СНК БССР за 3-е лістапада 1927 г., дала рад станоўчых вынікаў у адносінах паляпшэньня эканамічнага становішча бядняцкага працоўнага насельніцтва гэтых мястэчак.

Аднак, тэмп паказанай работы з прычыны сваёй недастатковасьці не адпавядае сучасным задачам гаспадарчага ўпарадкаваньня бядняцкага працоўнага насельніцтва мястэчак.

2. Народны Камісарыят Зямляробства і акруговыя выканаўчыя камітэты зусім слаба і несваячасова праводзяць плян гаспадарчага ўпарадкаваньня мястачковага насельніцтва, зацьверджаны пастановай Савету Народных Камісараў ад 24-га ліпеня 1929 г.

Выходзячы з гэтага, у дадатак да сваіх пастаноў ад 3-га лістапада 1927 г. і 24-га ліпеня 1929 г., Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Гаспадарчаму ўпарадкаваньню падлягае бядняцкае насельніцтва ня толькі мястэчак гарадзкога тыпу, але і мястэчак сельскага тыпу; а таксама бядняцкае насельніцтва менш буйных гарадоў.

2. Абавязаць Наркампрацы, ВСНГ і АВК прыняць меры да гаспадарчага ўпарадкаваньня большай колькасьці бядняцкага насельніцтва мястэчак, шляхам кваліфікацыі ў ЦІП, спецыяльных курсаў і г. д. і шляхам уцягненьня гэтага насельніцтва ў прамысловыя прадпрыемствы.

3. У мэтах стварэньня больших магчымасьцяй для ўцягненьня ў вытворчую працу сем'яў непоўнасьцю забясьпечаных працоўнай сілай, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Зямляробства і Белкалгасцэнтру пры складаньні гаспадарчых плянаў прадугледзець уцягненьне ў вытворчую працу магчыма большай колькасьці жанчын і поўнагадовых асоб з бядняцкага насельніцтва мястэчак, шляхам інтэнсыфікацыі гаспадаркі, развіцьця гародніцтва, птушніцтва і г. д.

4. У сувязі з арганізацыяй пры больш буйных насельніцкіх пунктах прыгарадных сельскіх гаспадарак (садова-гародных і малочных) прапанаваць Белсельтрасту, Белкалгасцэнтру і акруговым выканаўчым камітэтам прыняць меры да максымальнага ўцягненьня ў склад гэтых гаспадарак бядняцкага насельніцтва.

5. Папаўняць арцелі саматужна-прамысловай каапэрацыі шляхам уцягненьня ў гэтыя арцелі саматужнікаў, якія дагэтуль не ўваходзяць у склад гэтых арцеляй.

6. Прапанаваць Наркамзему, АВК і Белкалгасцэнтру праводзіць работу па ўцягненьні бядняцка-мястачковага насельніцтва ў калгасы. Для гэтай мэты, выходзячы з адсутнасьці ў бядняцкага мястачковага насельніцтва сродкаў вытворчасьці і інвэнтару, Белкалгасбанку прадугледзець водпуск кароткатэрміновых аваротных крэдытаў.

7. На працягу 1929-30—1931-32 г. **гаспадарча ўпарадкаваць 33.296 сем'яў бядняцкага насельніцтва мястэчак і менш буйных гарадоў** па наступных галінах:

Па саматужна-прамысловай каапэрацыі—22.681 ч.

Па сельска-гаспадарчай каапэрацыі (арганізацыя малочна-гародных калгасаў)—2.365 чал.

Па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы (галоўным чынам моладзі)—8.250 ч.

8. **Прыняць разьмер фінансавых выдаткаў на правядзеньне мерапрыемстваў, вызначаных плянамі па гаспадарчым упарадкаваньні бядняцкага, мястачковага і гарадзкога насельніцтва на працягу 1929-30 — 1931-32 г. у суме 9.246.200 руб.**

9. З сумы 622 тыс. руб., прадугледжанай у 1929-30 г. на ўпарадкаваньне мястэчак, вызначыць 100 тыс. руб. Белсампрамсаюзу на мерапрыемствы, якія вынікаюць з правядзеньня гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчак.

Астатнія 522 тыс. руб. выдаць на гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчак па лініі мерапрыемстваў па сельскай гаспадарцы, у першую чаргу ў тых мястэчках, дзе праца ў гэтай галіне, згодна пляну, зацьверджанага СНК, была пачата ў 1927-28 і 1928-29 г.

Дадаткова вызначыць на гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчак у 1929-30 г.—650 тыс. руб., якія разьмеркаваць наступным чынам:

На кваліфікацыю і пераквалiфікацыю з агульных сродкаў Наркампрацы—350 тыс. руб.; на гародніцтва—200 тыс. руб., на птушніцтва—100 тыс. руб.

10. Прапанаваць Наркамзему, Наркампрацы, Белсампрамсаюзу і АВК, з прыцягненьнем Белкамзету і яго органаў на мясцох, зараз-жа пачаць падрыхтоўку і распрацоўку канкрэтных вытворчых плянаў з тым, каб забясьпечыць поўнае правядзеньне ў вызначаныя тэрміны мерапрыемстваў па гаспадарчым упарадкаваньні бядняцкага насельніцтва мястэчак.

Прапанаваць памянёным ведамствам і АВК забясьпечыць правядзеньне пляну ўпарадкаваньня бядняцкага насельніцтва мястэчак належным апаратам (зямляўпарадчыкамі, агранамамі, інструктарамі і г. д.).

11. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі прасачыць за выкананьнем гэтай пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік спраў М. КАЛЕВІЧ.

ГАРАДОК НАВУКІ



Універсытэцкі гарадок — адна з лепшых старонак пяцігодкі культурнага будаўніцтва БССР.

Першая цагліна новага гарадка была заложана ў 10-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі — 6-га лістапада 1927 г.

У 13-ю гадавіну Кастрычніка універсытэцкі гарадок умесьціць у сваіх прасторных корпусох каля 3-х тыс. пралетарскіх студэнтаў самых далёкіх куткоў Савецкай Беларусі.

Дзе быў пустыр

На былым пустыры вырас цэлы гарадок — палац навукі і тэхнікі. Сваімі карпусамі ён раскінуўся на тэрыторыі ў 14 гэкт. Фасады яго выходзяць на 5 вуліц — Савецкую, Стара-Базарную, Ленінградзкую, Нова-Бабруйскую і Зямляробчы завулак. Гарадок зусім зьмяніў аблічча гэтых вуліц.

Універсытэцкі гарадок — буйнейшае універсытэцкае будаўніцтва ў Савецкім Саюзе за апошнія некалькі дзесяткаў год. Яно выдатна яшчэ і тым, што зьяўляецца выключна савецкай будоўляй. Ад эскізу да самых складаных канструкцый галоўнага аўдыторнага корпусу гарадок пабудаваны нашымі ўласнымі рукамі без дапамогі чужаземных кансультантаў; сваімі інжынэрамі і работымі

Саюзны ўрад, улічваючы вялізарны рост культурных патрэб працоўных мас БССР, уключыў будаўніцтва гарадка і клінік у саюзны бюджэт і **асигнаваў на гэту мэту звыш 6 млн. руб.**

З усіх 5 карпусоў, толькі адзін з іх —галоўны аўдыторны — накуль што яшчэ ня скінуў з сябе рыштаваньняў. Іншыя ўжо гатовы і студэнты вядуць там свае заняткі.

Палац навукі і тэхнікі

Аб грандыёзнасьці і размаху будаўніцтва гавораць наступныя лічбы: агульны аб'ём гарадка — 190 тыс. куб. мэтраў, будаўніцтва праглынула ўжо 10 млн. цаглін, 4.500 бочак цэменту, 10 тыс. куб. мэтраў бэтону, 60 вагонаў жалеза. Карпусы налічваюць у сваіх сьценах звыш 500 аўдыторый, лабараторый і інш. навучальных памяшканьняў.

Што-ж уяўляе сабою гарадок у закончаным выглядзе? Ён складаецца з карпусоў — галоўнага аўдыторнага, анатамічнага, прыродазнаўчага, хэмічнага і мэдыцынскага.

Мэдыцынскі факультэт абслугоўваецца двума карпусамі—анатамічным і мэдыцынскім, у якіх скапцэнтраваны ўсе мэдычныя катэдры. Асабліва цікавым зьяўляецца вялікая сэкцыйная заля анатамічнага корпусу, разьмерам у 375 кв. мэтраў. Сэкцыйная заля абсталявана магутнымі спэцыяльнымі ўстаноўкамі, прыточна-выцяжной вэнтыляцыяй, якія ліквідуюць трупны пах і даюць магчымасьць даводзіць тэмпэратуру ў залі ніжэй нуля, каб лапярэдзіць разлажэньне трупаў.

Сэкцыйная заля па сваім разьмеры і канструкцыі — адна з самых вялікіх і лепшых у Савецкім Саюзе. У цокальным паверсе анатамічнага корпусу абсталяваны спэцыяльны пакой для трупаў, адкуль па машыне яны падаюцца на 3-ці паверх у сэкцыйную залю, а таксама ў крэматоры.

У гэтым-жа корпусе знаходзяцца музэі для паасобных катэдраў і 2 вялікія аўдыторыі. У анатамічным і мэдычным корпусох ёсьць вялікая колькасьць розных аўдыторый, навуковых габінэтаў, лабараторый, абсталяваных водаправодам, каналізацыяй, газам, электрычнасьцю і рознымі сілавымі ўстаноўкамі.

Канчаюцца работы па пабудове Універсытэцкага Гарадка ў Менску. 500 аўдыторый, лябараторый і навуковых габінэтаў—плошчай у 14 гэкт., заняты навучальнымі карпусамі—такія разьмеры новага палацу навукі. 10 мільёнаў цаглін, 10.000 мэтраў бэтону, 60 вагонаў жалеза—такі размах гэтага буйнейшага ўнівэрсытэцкага будаўніцтва ў Саюзе. Ад пачатку навучальнага году каля 3.000 студэнтаў будуць праходзіць вучобу ў сьценах новага гарадку. У матар'яле, якія ніжэй друкуюцца, чытач падраблязна азнаёміцца з ходам будаўніцтва на тэрыторыі гарадка.

Прыродазнаўчы корпус умяшчае ў сябе акрамя іншага 2 аранжарэі, якія знаходзяцца на 3-ім паверсе ў спэцыяльных памяшканьнях са шкла. Цэнтральная кацельная і мэханічнае аддзяленьне з усімі ўстаноўкамі размешчаны ў прыродазнаўчым корпусе.

У хэмічным корпусе лябараторні абсталяваны паводле апошняга слова хэмічнай тэхнікі. У іх налічваецца каля 300 хэмічных сталоў, забясьпечаных газавымі гарелкамі, каналізацыяй, водаправоднымі трубамі і электрычнасьцю.

Галоўны корпус Гарадка

Галоўны аўдыторны корпус — гордасьць універсытэцкага гарадка. Ён сваім аб'ёмам — 65 тыс. куб. мэтраў. Ён самы большы. У ім будуць знаходзіцца праўленьне універсытэту, дэканаты, студэнцкія арганізацыі, факультэт савецкага будаўніцтва і права і г. д. У цэнтральнай частцы корпусу — актавая заля на 1.000 чал. У цокальным паверсе будуецца інтэрнат для студэнтаў на 250 чал. Над актавай залёй на плоскім даху разьмерам у 900 мэтраў абсталёўваецца сад.

У кожным з карпусоў ёсьць памяшканьне для жывёны, вэнтыляцыйныя камэры, умывальнікі, душы і г. д.

Як ідзе будаўніцтва

Універсытэцкі гарадок — адно з першых у Савецкай Беларусі буйных будаўніцтваў, дзе ўсе асноўныя работы мэханізаваны. Тут ёсьць вузка-калёйка, бэтона-растворамяшалкі, мэханічная афарбоўка, фарбапэркі, вугля і камянь-драбілкі. Адных толькі мэханічных падъёмнікаў было ўстаноўлена каля адзінаццаці.

Будаўніцтва Універсытэцкага Гарадка мела рад сур'ёзных прарываў, што прымусіла ўрадавую камісію адтэрмінаваць сканчэньне пабудовы гарадка да 1-га жніўня 1930 г., замест 1-га лістапада 1929 г.

Толькі за апошні час гарадок пачаў рэгулярна атрымліваць ад тэхнагляду Наркамасьветы рабочыя чарцяжы. Дагэтуль усе праекты наступалі самацёкам з вялікім спазьненьнем.

Пры праектаваньні гарадка была дапушчана вельмі сур'ёзная недарэчнасьць. Ня ўлічылі патрэбнасьць пабудовы на тэрыторыі гарадка клінік. У выніку мэдфак ВДУ адарваны ад вытворчасьці, тэарэтычныя заняткі ня ўвязаны з практычнымі. Студэнтам мэдфаку прыдзецца пасьля кожнай лекцыі езьдзіць у другі канец гораду — Барысаўскі тракт для работы ў клініках.

Будаўніцтва гарадка адзін з нямногіх аб'ектаў, якія забясьпечаны асноўнымі будаўнічымі матар'ялямі. Рабочыя і тэхнічны санал ажыцьцявілі рад мерапрыемстваў па рацыянальным скарыстаньні дофіцытных матар'ялаў. Увесь матар'ял з рыштаваньняў выкарыстаны пад падлогі, лагі, апалубкі. Гэтыя мерапрыемствы ўжо далі эканомію звыш 40 тыс. руб. Эканомлены дзесяткі скрынак цьвікоў, тысячы дошак і г. д.

Работы па ўсім гарадку ўжо выкананы на 93 проц., а па галоўным корпусе —на 80 проц.

Сканчэньне будаўніцтва затрымліваецца майстэрнямі Белдзяржбуду, якія выканалі заяўку на сталярна-сьлясарныя вырабы толькі на 30 проц. Не хапае драўляных і жалезных пераплётаў, няма водаправодных труб. Каб не затрымліваць работу, прыходзіцца спачатку рабіць штукатурку, а потым пераплёты.

Хібы пабудовы

На будаўніцтве занята 660 чал. Ударніцтва і сацспаборніцтва разгорнута недастаткова. Ва ўдарны рух ня ўцягнуты сэзсьнікі. На ўсім гарадку ударнікаў усяго 150 чал.

Лепшая ўдарная брыгада — чорнарабочая, якая складаецца з 20 чал. Брыгада чорнарабочых-ударнікаў паказвае лепшыя прыклады работы. Яны ня маюць ніводнага прагулу. Заданьне выконваецца на 100 проц. Заработак ударнікаў-чорнарабочых павялічыўся з 2 р. 38 кап. да 4 р. 30-50 к. Брыгады ударнікаў-водаправодчыкаў павялічылі прадукцыйнасьць працы на 12 проц.

На будаўніцтве яшчэ маюць месца рвацтва, прагулы, парушэньні працоўнай дысцыпліны, асабліва сярод новых кадраў рабочых, пераважна моладзі. Арцель штукатураў з 38 чал. выяўлена, як ілжэ-ўдарная. Пяць арцеляй штукатураў зьняты з работы за дрэнную якасьць работы.

Прамфінплян дагэтуль яшчэ не даведзен да арцелі, да кожнага рабочага. Рабочы будаўнік ня ведае вытворчай праграмы гарадка.

Каапэрацыя не падрыхтавалася да абслугоўваньня рабочых. Сталоўка разьлічана на 600 абедаў, а адпускае — 1.400, абслугоўваючы ўвесь раён. У сталоўцы бруд, пастаянныя «храсты».

* * *

Універсытэцкі гарадок — адно з буйнейшых дасягненьняў у культурным будаўніцтве БССР. Белдзяржбуд, прафэсыянальныя і партыйныя арганізацыі, каапэрацыя павінны забясьпечыць сканчэньне будаўніцтва ў тэрмін, вызначаны ўрадам БССР.

МЕНСК

АКРУГОВЫЯ КАНФЭРЭНЦЫІ ПА ГРАМАДЗКІМ ХАРЧАВАНЬНІ

Цэнтральная камісія па аглядзе грамадзкага харчаваньня пастанавіла ў працягу чэрвеня склікаць акруговыя канфэрэнцыі па грамадзкім харчаваньні. На канфэрэнцыі выедуць прадстаўнікі цэнтральнай камісіі.

На акруговых канфэрэнцыях будуць заслуханы даклады ЦРК аб пэрспэктывах грамадзкага харчаваньня і справаздачы акруговых аглядавых камісій.

На Гомельскай, Віцебскай і Менскай канфэрэнцыях будуць пастаўлены даклады аб пяцігодцы разьвіцьця грамадзкага харчаваньня.

СПЫНЕНА КАНТРАКТАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ

У зьвязку з пастановай урадавай камісіі пры СНК СССР, Наркампрацы БССР спыніў выдачу парадаў на кантрактацыю студэнтаў. Уводзіцца новая сыстэма разьмеркаваньня скончыўшых ВНУ і тэхнікумы, шляхам прымацаваньня навучальных устаноў да адпаведных галін народнай гаспадаркі.

ПЕРАДАЧА ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ ВСНГБ

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР пастанавіў рэарганізаваць лясную гаспадарку БССР.

Увесь дзяржаўны лясны фонд са ўсёй загатоўленай лесапрадукцыяй пераходзіць пад загад ВСНГБ.

Да ВСНГБ пераходзіць цэнтральны і мясцовы апараты лясных органаў НКЗ, увесь інвэнтар, пабудовы і прылады. Лясы мясцовага значэньня застаюцца за сельсаветамі і РВК.

ПАБУДОВА ЦУКРОВАГА АГРА-КАМБІНАТУ

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР пастанавіў пабудаваць у 1930-31 г. у Бранінска-Хойніцкім раёне, Гомельскай акрузі бурачна-цукровы аграіндустрыяльны камбінат. Пад камбінат павінна быць адведзена ня менш 5 тыс. гэкт. зямельнай плошчы, на якой будуць засеяны цукровыя буракі.

На тэрыторыі камбінату будзе пабудаваны цукровы завод, які будзе перарабляць 100 тыс. тон буракоў у сэзон.

РЭАЛІЗАЦЫЯ ЛЁТАРЭІ АЎТАДОРУ.

На сёнешні дзень першы разрад білетаў лётарэі Аўтадору рэалізаваны ў БССР поўнасьцю. Усяго прадана 30 тыс. білетаў, на суму 15 тыс. руб. Розыгрыш 1-га разраду адбудзецца 1-га ліпеня.

ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ

Наркампрацы адкрыў у Менску трохмесячныя курсы наборшчыкаў-разборшчыкаў шрыфтоў, курсы машынапісі на 25 чал., і шэсьцімесячныя курсы працаўпікоў прылаўку на 158 чал. 15-га чэрвеня адкрываюцца шэсьцімесячныя курсы шофэраў на 200 чал.

ВЭЛЁ-ПРАКАТНЫ ПУНКТ

З 1-га чэрвеня ў Менску, па Ленінскай вуліцы, адкрыты першы вэлё-пракатны пункт Аўтадору. Кошт пракату вэлёсыпэдаў для членаў Аўтадору—60 кап., для членаў саюзаў—70 кап. і для іншых—1 руб. за гадзіну пракату.

ПРАВЕРКА АРТЫСТЫХ ЭСТРАДЫ

З 7-га чэрвеня ў Менску пачалася праверка і перакваліфікацыя артыстых эстрады. У хуткім часе гэтакая праверка будзе праведзена па ўсёй БССР.

З лістоў рабселькораў

ПЛЯН УЛОВУ РЫБЫ ЗРЫВАЕЦЦА

Мазырскае аддзяленьне Белсампрамсаюзу атрымала ад Белсампрамсаюзу рознага начыньня для ўлову рыбы на суму 4.638 руб. 98 кап. Пры атрыманьні начыньня выявілася, што яно ўсё было згніўшае. Мазырскае аддзяленьне не прыняло начыньня і адправіла яго назад. У выніку чаго плян улову рыбы зрываецца.

Адпаведным арганізацыям неадкладна трэба заняцца высьвятленьнем гэтае справы і прыцягненьнем вінаватых да адказнасьці. Т. А.

ЗЛАЧЫНЦА НЕ ПАКАРАНЫ

Перавышары камітэту ўзаемадапамогі ў Крычаве адбыліся ў часе калектывізацыі, на што было зьвернута мала ўвагі. Перавышары прайшлі пры дэмабілізацыйным настроі. Прайшло ўжо каля паўгода, як адбыліся перавыбары, а былы старшыня Ільлін яшчэ да гэтага часу не перадаў спраў новаму складу Камітэцкіх грошай у Ільліна таксама ніхто ня пытае.

Член рэвізійнай камісіі тав. Мазалькоў С. аб усім гэтым давёў да ведама партыйныя і савецкія арганізацыі, але ніякіх вынікаў няма. Больш таго, Ільлін прысвоіў выйгрыш па аблігацыі камітэту ўзаемадапамогі. Акт аб растрэце Ільліным камітэцкіх грошай перададзены сьледчым органам яшчэ ў красавіку месяцы, але і да гэтага часу няма ніякіх вынікаў.

Зараз-жа трэба заняцца гэтым пытаньнем. С.

ЗРЫВАЕЦЦА ЗАГАТОЎКА СЬВІНЫХ СКУР

Згодна пастановы адпаведных органаў здатчыкі сьвіных скур павінны быць прэміраваны падносками. Але Аршанскае аддзяленьне Скурсындыкату гэтай пастановы ня хоча выконваць. У красавіку месяцы было здана каляскі пікамі 5 сьвіных скур, але загадчык праўленьня Розаў адмовіўся выдаць ім прэмію, матывуючы тым, што ён, як бынцам, ня ведае аб такой пастанове і ці падлягаюць прэміраваньню арганізацыі.

Такія адносіны з боку Розава падрываюць справу загатоўкі сьвіных скур. Калгасьнік.

ПАШЫРАЕМ ПАДПІСКУ НА «ЗЬВЯЗДУ»

Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб распаўсюджаньні газэты «Зьвязда» не знайшла спачатку належнага адбітку ў вайсковых беларускіх палках. Да апошняга часу нельга было ў вайсковай часьці знайсьці «Зьвязду» або «Савецкую Беларусь». І толькі пасьлядняя палкавое бюро КП(б)Б № скага артпалка прыняло пастанову аб падпісцы ўсёй партарганізацыі на газэту «Зьвязда». У выніку падпіска ўжо дасягнула 45 экз. Работа па распаўсюджаньні «Зьвязды» працавецца. Іншыя палкавыя партарганізацыі павінны таксама прыняць усе захады да пашырэньня «Зьвязды» сярод партыйцаў вайсковых часьцей. А.

Што перадае Менская радыё-станцыя

Серада, 11-га чэрвеня

18-00—Пасьлябедзены канцэрт.
18-30—Гадзіна Дому Асьветы: Хворы і доктар—д-р Гольдзін.
19-00—Беларуская радыё-газэта.
20-00—Праверка часу.
20-00—Гадзіна калектывістага.
20-30—Навукова-тэхнічная перадача.
21-00—Газэта на польскай мове.
21-30—Даклад: Калгасы на ўсебеларускай выстаўцы—тав. Сафарэвіч.
22-00—Канцэрт.

Чацьвер, 12-га чэрвеня

18-00—Пасьлябедзены канцэрт.
18-30—Перадача для піянэраў і вучняў.
19-00—Беларуская радыё-газэта.
20-00—Праверка часу.
20-00—Сялянская радыё-газэта.
21-00—Гадзіна прафработніка.
21-30—Даклад: Птушніцтва на Ўсебеларускай выстаўцы і яго будучыня—тав. Канавальчык.
22-00—Канцэрт.

Пятніца, 13-га чэрвеня

18-00—Пасьлябедзены канцэрт.
18-30—Гадзіна пралетарскага студэнцтва.
19-00—Беларуская радыё-газэта.
20-00—Праверка часу.
20-00—Камсамольская перадача.
20-30—Навукова-тэхнічная перадача
21-30—Даклад: Сілас і яго роля ў жывёлагадоўлі і што пакажа выстаўка глядачу аб сіласе—тав. Журык.
22-00—Канцэрт.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Мясцком хатніх работніц № 2. У памяшк. клюбу нархарч (Энгельсе, 6) адбудзе агульны сход хатніх работніц. Яўка абавязк. Пач. а 7 гадз. веч.

Рэспубл. бюро АРУ. У памяшк. АРУ (Савецкая, 65) адбуд. сход актыву вытворчага сэктару АРУ. Запраш. усе жадаючыя працаваць у гэтым сэктары. Пач. а 7 гадз. веч.

БДУ. У актавай залі адб. агульны адкрыты сход калектыву ЛКСМБ ВДУ. У парадку дня: справаздача бюро калектыву аб праробленай працы і давыбары бюро калектыву. Запрашаюцца студэнты. Пач. а 7 гадз. веч.

Дом Асьветы. З 10-га чэрвеня ў бібліятэцы Дому Асьветы будзе праводзіцца выдача кніжак толькі па цотных лічбах з 6 да 10 гадз. веч.

Кастрычн. РК МОПР'у. У памяшк. Кастр. райкому МОПР'у адбудз. нарада вытыбных яч. МОПР'у. Прысутнасьць старшынь і сакратароў абавязкова. Там-жа адбудзецца мопрактыў. Прысутнасьць абавязак. Пач. а 7 гадз. веч.

ЗАЎТРА

Фрунзаўск. РК КП(б)Б. У памяшк. АК КП(б)Б (заля пасядж., 3-ці паверх) адбудз. раённая нарада кіраўнікоў сэктароў партвучобы па пытаньні аб ходзе падрыхтоўчай працы, па арганізацыі гурткоў, на прапрацоўцы зьвязды і аб сетцы партучобы на 1930-31 год. На нараду павінны зьявіцца ўсе кіраўнікі гурткоў. Яўка абавязк. Пач. а 6 гадз. веч.

ЖАКТ № 11. 11-V а 7 гадз. увечары ў памяшканьні сталоўкі ЖАКТ'у № 11 (Камсамольская, 40) адбудзецца нарада жыхароў—камуністых ЖАКТ'у № 11.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

ПАСТУПІЎ У ПРОДАЖ

Д. МАНУІЛЬСКІ. АД XV ДА XVI ЗЬЕЗДУ УСЕКП(б)

ДАКЛАД на XIII ЗЬЕЗЬДЗЕ КП(б)Б. Стар. 81. Цана 12 кап.

КІНО-САД (Савецкая, 71)
АД АЎТОРКА, 10 ЧЭРВЕНЯ
НОВЫ ЗАМЕЖНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ПАВОДЛЕ СЦЭНАРЫЯ ЛАУРЭНСА СТОЛІНГ
Рваныя ветразі
— у 8 частках —
У гал. роп. Чарльз Фарэль, Эстэр Ральстон, Уолес Біры і Джордж Банкрофт.
ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 9 гадз.
— Каса адкрыта з 6 гадз. —

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
Ад аўторка, 10 чэрвеня
2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі
„КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА"
2 сэрыі 12 частак у адзін сэанс
Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз.
Каса адкрыта з 12 гадз.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
АД АЎТОРКА, 10 ЧЭРВЕНЯ
— Апошняя 3-я сэрыя —
МІСТЭРЫ
у 10 частках
Пачатак 1-га сэансу а 7 г.
Каса адкрыта з 5 гадз.

Тэатр саду „Прафінтэрн"
Мастацкі перасовачны тэатр „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ"
Сёньня, 10 чэрвеня, адкрыты спэктакль „Человек с портфелем"
Білеты ў раб. касе. Астача білетаў у касе саду
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Гастролі 1-га Масковскага перасовачнага тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ
Сёньня, 10 чэрвеня „СЕВИЛЬСКИЙ ЦИРУЛЬНИК"
Білеты ў касе тэатру і раб. касе Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

Дом Асьветы 15 чэрвеня
КАНЦЭРТ ансамблю жаночай творчасьці
Прымаюць удзел: артыстка савецкай філярмоніі Роза УШАНСКАЯ (скрыпка), артыстка Масковск. Дзярж. Оперы А. А. ЛАРЫНА (сапрано) і салістка савецкай філярмоніі М. А. ГРЫМБЭРГ (раяль).
У праграме—творы расійскіх і замежных кампазытараў.
БІЛЕТЫ Ў КАНЦЫЛЯРЫІ ДОМУ з 12—2 і з 6—10 гадзін увечары.

ЗАВОД ЭЛЬВОДА ПАВЕДАМЛЯЕ АБАНЭНТАЎ, што, згодна загаду ВСНГБ, абавяз. нага ў газ. „Савецкая Беларусь" ад 22 сакавіка г. г. — ЭЛЬВОДАМ — БУДЗЕ СПЫНЕНА ПАДАЧА ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ

Зьнімаюцца ў абанэнтаў ЛІЧОТЫКІ для праверкі ў палаце мер і вагі.
На зьяўленьне лічотыкаў мацёры маюць адведзены пасьведчаньні, якія будуць перанадаваць заціцьвіо шчотыкаў.
Абавязкам, якія будуць перанадаваць заціцьвіо шчотыкаў.

Кіно «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
з прычыны вялікага посьпеху 2-гі ТЫДЗЕНЬ ПАСТАНОЎКІ мастацкая кіно-аповесьць ВЕЦЕР у ТВАР
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: —
кіно-хроніка БЕЛДЗЯРЖКІНО «БЕЛАРУСЬ САВЕЦКАЯ» № 6, прысьвечаная XIII зьезду КП(б)Б.
ПАЧАТАК 1-га сэансу а 7 гадз. —— КАСА—ад 5 гадз.

Кіно „СПАРТАК" Ад аўторка, 10 чэрвеня
нямецкі мастацкі баявік
ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ ў 7 част. У галоўнай ролі ІСЕНІЯ ДЗЕСЬНІ
ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 7 гадз., 2-га—9 гадз., 3-га—10 гадз. 45 м.
—— КАСА—з 5 гадз. 30 м. ——

ЖБКТ „АСЬВЕТНІК КАМУНАР"
ПРОСІЦЬ УСІХ ЧЛЕНАЎ ЖБКТ, ЯКІЯ ЗАПОЎНІЛІ АНКЕТЫ НА ПАБУДОВУ КВАТЭР, зьявіцца да 15-га чэрвеня да т. Гарашчэні ў БАН
для падпісаньня паявых абавязацельстваў і азнаямленьня з умовамі.
Праўленьне.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ УЗАЕМАДАПАМОГІ —
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурапа-вэнэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрытыя з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

ЛАНЦУЦКІЯ с/с, Капыльскага раёну, Менскай акругі, выклікае на 17 ЧЭРВЕНЯ 1930 году гр. СКУБСКАГА Уладыслава і СКУБСКУЮ Матыльду па справе скасаваньня шлюбу

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяраніце на тэл. 7-81

50 кошт публікацыі аб згубе дакумента

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

Пашп. № 800 Нодэльман Т. М., выд. Тураўск. РВК. 468
Вуч.-конск. кн. Купрацэвіч А. А. 469
Камсам. біл. № 93611 Ганчарова Е. С., выд. Віцебск. АК ЛКСМБ. 470
Вуч.-конск. кн. №1965 Кокуша Л. П., выд. Лепельск. РВК. 471
Вайск. біл. Васіленка П. Е., выд. Чавуск. РВК. 472
Вайск. кн. Фэйгіна Х. Е., выд. Барысаўск. РВК. 473
Пашп. Явелава К. А., выд. Корэцкаўск. с.-с. 474
Каап. кн. № 8187 Макоўскага С., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам «Смычка» 475
Вуч.-конск. кн. № 45 Шукала Ф. Г. 476
Бірж. карт. Савулькінай З., выд. Барысаўск. страхкасай. 477
Пасьведч. аб сканчэньні Блонск. школы Мезен С. 478
Пашп. Арлоўскага А. Т., выд. Смаленск. міліцыяй. 479
Вуч.-конск. кн. Янчэўскага С. З., выд. Чавуск. РВК. 480
Чл. біл. саюзу працасьветы Шавура Ф. М., выд. Полацк. акраддз. саюзу. 481
Чл. кн. № 688 Шутава А. Д., выд. Клясьніцк. спаж. т-вам. 482
Каап. кн. № 5458 Клімец П. К., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам. 483
Паявая кн. № 2128 Ціханенка Е., выд. Сіроцінск. спаж. т-вам. 484
Пашп. Кавалева Я. Н., выд. Чавуск. міліцыяй. 485
Каап. кн. № 417 Дзюбайла І. М., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам. 486
Паявая кн. № 4247 Александровіча І., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам. 487
Пасьведч. аб сканчэньні Езярышчанск. 7-годкі Іванова А. Г. 488
Віза, выд. Заслаўск. пагранатр., мэтр. вып., выд. Мен. ЗАГС'ам на імя Краснаўскага В. 489
Каап. кн. Швэда Я. [illegible] Заслаўск. спаж. т-вам. 490
Вайск. кн. № 5[illegible] выд. Халопенніц[illegible] 491
Вайск. біл. Жогаль Д. Г., выд. Жытковіцк. РВК. 492
Вайск. біл. Іванова С. А, выд. Талачынск. РВК. 493
Чл. біл. саюзу гарбароў Кандрашова А. А. 494
Чл. біл. саюзу будаўнікоў Рашотнікава І. А. 495
Вайск. кн. Рашотнікава І. А., выд. 97 п. 496
Паявая кн. Рашотнікава І. А., выд. Чавуск. спаж. т-вам. 497
Паявая кн. № 9 Шухмана І., выд. Сіроцінск. спаж. т-вам. 498
Каап. кн. № 159 Гігілева Я. М., выд. Клясьніцк. спаж. т-вам. 499
Партызанск. пасьведч. Куліка Ю. М., выд. Сьмілавіцк. РВК. 500
Вайск. кн. Будзневіча М. І., выд. б. Кіпчына-Слабодск. ВВК. 501
Вайск. кн., выд. б. Кнорынск. ВВК, каап. кн., выд. М.-Горск. спаж. т-вам імя Немагай В. П. 502
[illegible] і [illegible] 503
Пашп. № 27 Макацэвіча М. М., выд. Бараўск. с.-с. 1064
Пашп. Розэнкранц Б. І., выд. Мен. міліцыяй 1065
Камсам. біл. № 102025 Бакштэйна І. М., выд. Мен. АК